

НОВАЕ Ў «ЗЯЛЁНАЙ» ЭНЕРГЕТЫЦЫ **2**



ЯК АДРАДЖАЕЦЦА СТАРЫ ЗАМАК У ГРОДНЕ **3**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СЕРАДА

№ 9 (28876)

## Найважнейшая задача — палепшыць жыццё людзей

### Прэзідэнт узгадніў шэраг кадравых назначэнняў

**Учора ў Палацы Незалежнасці адбыўся без перабольшання вялікі кадравы дзень. Новыя асобы з'явяцца як сярод кіраўніцтва мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, так і ў айчынным дыпламатычным корпусе. Больш за тое, у Беларусі прызначаны новы міністр і новы рэктар адной з устаноў вышэйшай адукацыі.**

**ПРА МІНСК І ЯГО РАЗВІЦЦЁ**

Так, на пасаду намесніка старшыні Мінскага гарвыканкама быў узгоднены Аляксандр Дарахові́ч, які раней займаў пасаду кіраўніка адміністрацыі Заводскага раёна Мінска.

Яшчэ адным намеснікам старшыні Мінскага гарвыканкама стаў Арцём Цуран, раней — кіраўнік адміністрацыі Фрунзенскага раёна сталіцы.

«Няма неабходнасці нешта дэталізаваць, мы з вамі сустракаліся, свой пункт гледжання я выказаў. Вядома ж, мы рэакцыю мінчан і вашу адсочвалі. Мне далажана, людзі ў агульным плане, нават у дэталях падтрымліваюць вынікі нашай нарады. Вельмі прашу вас, паколькі вы будзеце разам з новым старшынёй гарвыканкама рэалізоўваць гэтую палітыку, прытрымлівацца тых даручэнняў, якія былі выказаны мною на нарадзе», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт падкрэсліў: Мінск неабходна зрабіць абсалютна ўтульным горадам, каб мінчане ім ганарыліся. Ён нагадаў, што 2019-ы стане для сталіцы вельмі няпростым — і не толькі з-за чарговых выбараў і Еўрапейскіх гульняў. Галоўнае, на думку Аляксандра Лукашэнкі, тая работа, якую павінны зрабіць сёлета па ўладкаванні і добраўпарадкаванні Мінска. «Зрабіць гэта нефармальна, каб горад быў вельмі чысты і акуратны», — адзначыў ён.

Беларускі лідар нагадаў пра адказнасць за парушэнне законаў і прэзідэнцкіх даручэнняў.

**ПРА МІНСКУЮ ВОБЛАСЦЬ І ЯЕ ЗНАЧНАСЦЬ**

Старшынёй Вілейскага райвыканкама стаў Алег Бегунец, раней — першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Старадарожскага райвыканкама.

СТАР. 2

## І ЗІМОЙ РАСТУЦЬ ПАВЕРХІ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Валерый ВАЛАДЗЬКО і Максім АСТАШОНАК *(на фота)* у складзе брыгады муляраў Жодзінскага «Будаўнічага ўпраўлення 161» узводзяць жылы шматкватэрны дом у суседнім Лагойску. Не першы год гэтыя будаўнікі працуюць разам, сталі класнымі спецыялістамі, дзеляць камандзіровачныя вахты. Мужчынам прыходзіцца працаваць на вышыні і ў самых розных умовах надвор'я, іх не палохаюць завіруха і мароз.**

### *ЛІЧБА ДНЯ*

**108,4 %**

*склалі рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ў студзені — лістападзе 2018 года да ўзроўню студзеня — лістапада 2017-га, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. У агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 64 %, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 8 %, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву) — 23,5 %, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,5 %.*



## Беларусь — надзейны сябар Турцыі,

### І ТАКІ КУРС ЗАХАВАЕЦЦА

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з міністрам нацыянальнай абароны Турэцкай Рэспублікі Хулусі Акарам.**

«Мне прыемна сустрэцца з чалавекам, які заклікаНы шмат у чым вызначаць як унутраную, так і знешнюю палітыку Турэцкай Рэспублікі ў сувязі з той сітуацыяй, якая складваецца ў вашым рэгіёне», — адзначыў у пачатку сустрэчы беларускі лідар.

Прэзідэнт дадаў, што ў нашай краіне вельмі ўважліва назіраюць за дзеяннямі турэцкіх узброеных сіл. Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку эфектыўнасці і планавасці дзеянняў арміі Турцыі. Ён таксама падкрэсліў: у Беларусі разумеюць, што Турцыі вельмі няпроста, ажыццяўляецца масіраваны ціск вельмі моцных дзяржаў. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што народ Турцыі — гэта мужныя людзі, і яны справяцца ў гэтых умовах з тымі праблемамі, якія сёння навязваюцца і прыўносяцца не толькі ўнутры Турцыі, але і звонку.

«Вы павінны ведаць, што мы заўсёды былі надзейнымі сябрамі і партнёрам вашай краіны, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Мы заўсёды імкнуліся рабіць так, як лепш для Турцыі. І вы павінны ведаць, што мы будзем адданыя гэтаму курсу як у эканоміцы, гандлі, так і ў ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве».

Ён перадаў самыя добрыя пажаданні турэцкаму лідару Рэджэпу Таіпу Эрдагану і выказаў надзею, што яго краіна зможа пераадолець усе цяжкасці і насуперак усяму падняцца яшчэ на адну прыступку развіцця.

У сваю чаргу турэцкі міністр адзначыў, што Прэзідэнт Турцыі чакае беларускага лідара з візітам у самы бліжэйшы час.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

1919 — 2019 гадоў Беларускай дыпламатычнай службе

## МІЖНАРОДНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ СУВЕРЭННАЙ ДЗЯРЖАВЫ

**Гэтымі днямі дыпламатычная служба Беларусі адзначае векавы юбілей. 22 студзеня 1919 года на старонках газеты «Звязда» была размешчана першая публічная аб'ява аб пачатку дзейнасці Камісарыята замежных спраў ССРБ. Невялічкая нататка, усяго пяць радкоў (і нават не на першай старонцы), абвясціла аб заснаванні аднаго з самых важных ведамстваў краіны. Сімвалічна, што дыпламатычная служба — равесніца Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая стала падмуркам сучаснай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. З таго часу наша краіна прайшла шмат цяжкіх выпрабаванняў на шляху да суверэнітэту, да права праводзіць незалежную знешнюю палітыку. Пра 100-гадовы шлях і сённяшні дзень Міністэрства замежных спраў — эксклюзіўнае інтэрв'ю з кіраўніком знешнепалітычнага ведамства Уладзімірам МАКЕЕМ.**



***— Міністэрства замежных спраў Беларусі было заснавана ў савецкі час, і большую частку сваёй гісторыі праводзіла ў жыццё знешнюю палітыку СССР. Што ў сваёй рабоце ведамства атрымала ў спадчыну з таго перыяду і наколькі складана было выбудаваць МЗС незалежнай Беларусі?***

— Скажу адразу — мноства няпростых задач, вырашаць якія на пачатковым этапе прыходзілася вельмі нешматлікім колам супрацоўнікаў, а па многіх пытаннях і без адпаведнага вопыту.

Але давайце пачнём з гісторыі. Вытокі сучаснай беларускай дыпламатычнай службы прыходзяцца на 1917—1919 гады і звязаны са стварэннем Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі. Заснаваны ў студзені 1919 года Камісарыят па замежных справах узначаліў член часовага ўрада Усевалад Сцяпанавіч Фальскі. Сімвалічна, што інфармацыя аб пачатку дзейнасці Камісарыята была апублікавана 22 студзеня 1919 года менавіта ў газеце «Звязда». На той час у ведамстве працавалі 12 чалавек.

Камісарыят па замежных справах ССРБ, Міністэрства замежных спраў БССР былі папярэднікамі МЗС незалежнай Рэспублікі Беларусь.

Варта адзначыць, што ў савецкі час сфера міжнароднай дзейнасці БССР у параўнанні з іншымі саюзнымі рэспублікамі, за выключэннем Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, была даволі шырокай. Скажу больш — былі пытанні ў межах шматбаковай дыпламатыі, за якія ў саюзным маштабе адказвала менавіта беларуская дыпламатычная служба.

БССР абіралася непастаянным членам Савета Бяспекі ААН і была ініцыятарам шэрагу рэзалюцый Генасамблеі ААН у сферы міжнароднай бяспекі і раззбраення. Прадстаўнікі рэспублікі прымалі актыўны ўдзел у рабоце больш чым паўсотні міжнародных арганізацый і органаў сістэмы ААН. Беларускія дыпламаты займалі, напрыклад, адказныя пасады памочніка старшыні Міжнароднай Арганізацыі Працы, намесніка старшыні сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, шэрагу канферэнцый Міжнароднай Арганізацыі Працы, пасады старшыні, намеснікаў старшыні, дакладчыкаў камітэтаў Генеральнай Асамблеі і органаў сістэмы ААН.

Яшчэ ў дасаюзны перыяд БССР заключыла дзевяць шматбаковых і тры двухбаковыя дагаворы і пагадненні.

СТАР. 4-5

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Венесуэла абвінавачвае 11 краін Лацінскай Амерыкі ў спробе дэстабілізацыі сітуацыі ў краіне



Міністэрства замежных спраў Венесуэлы лічыць, што ўрады 11 лацінаамерыканскіх краін па ўказанні ЗША спрабуюць дэстабілізаваць палітычную сітуацыю ў Балівары́янскай Рэспубліцы з мэтай звяржэння прэзідэнта Нікаласа Мадура. Пра гэта гаворыцца ў заяве ведамства, якую размясціў на сваёй старонцы ў Twitter яго кіраўнік Хорхе Арэаса. «Баліварыянскі ўрад Венесуэлы асуджае ціск групы ўрадаў-сатэлітаў, падпарадкаваных ЗША, з мэтай дэстабілізаваць сітуацыю і выкарыстоўваць яе супраць законна абраных дэмакратычных інстытутаў краіны», — адзначае МЗС. На яго думку, кіраўніцтва Аргенціны, Бразіліі, Канады, Чылі, Калумбіі, Коста-Рыкі, Гватэмалы, Гандураса, Панамы, Парагвая і Перу «незаконна прымаюць на сябе паўнамоцтвы вызначаць легітымнасць венесуэльскай улады». «Вышэйназваныя ўрады аддаюць свае галасы, каб справакаваць сітуацыю ўнутрыпалітычнай нестабільнасці, апраўдаць замежнае ўмяшанне, да якога імкнуцца ЗША без якіх-небудзь абгрунтаванняў», — адзначаецца ў заяве. Ведамства заключае, што ўлады краіны «дэталёва прааналізуюць падобныя варожыя дзеянні і будуць прымаць рашэнні, якія гарантуюць абарону дзяржавы, яе інстытутаў і нацыянальнага суверэнітэту». Як вядома, у мінулы чацвер пераможца прэзідэнцкіх выбараў у Венесуэле Нікалас Мадура ўступіў на пасаду кіраўніка дзяржавы. Выбары прэзідэнта Венесуэлы адбыліся 20 мая 2018 года. Дзейны кіраўнік дзяржавы набраў амаль 6,2 млн галасоў выбаршчыкаў, а ягоны асноўны сапернік Энры Фалькон ад апазіцыйнай партыі «Прагрэсіўны авангард» — 1,9 млн.

ISSN 1990 - 763X

### Яйка набрала 40 млн «лайкаў» і стала новай зоркай Instagram



Новым рэкардсменам фотасэрвіса Instagram, які належыць сацсетцы Facebook, стаў здымак звычайнага курынага яйка, размешчаны ў запісе @world_record_egg. Фота было апублікавана 4 студзеня. На цяперашні момант яно з'яўляецца адзінай для гэтага ўліковага запісу Instagram. Невядомы стваральнік акаўнта першапачаткова паставіў мэту ўсталяваць новы рэкорд па колькасці лайкаў у Instagram. Для гэтага здымку яйка трэба было перасягнуць дасягненне мадэлі Кайлі Джэнер, здымак якой з нованароджанай дачкой набраў каля 18,3 мільёна «лайкаў». Дзякуючы актыўнаму распаўсюджванню спасылкі на фотаздымак пры ўдзеле многіх карыстальнікаў гэтую мэту ўдалося дасягнуць усяго за некалькі дзён. У сувязі з устаноўленым рэкордам некаторыя расійскія карыстальнікі выказалі здагадку, што на фатаграфіі намалявана праславутае «дзясятае яйка». Гэты жарт звязаны з нашумелай на мінулым тыдні навіной пра тое, што на прылаўках расійскіх крамаў з'явіліся ўпакоўкі з дзевяццю яйкамі. Як піша TJ, у адказ на рэкорд Джэнер апублікавала відэа, на якім разбівае курынае яйка, з подпісам «Падавіся, маленькае яечка». Партал BuzzFeed звязаўся з уладальнікам акаўнта, каб даведацца аб прычынах раптоўнага флэш-мобу. «Для мяне гэта быў выклік. Нічога асабістага», — адказаў аўтар самай папулярнай Instagram-публікацыі ў свеце. Між тым «на яйка» ўжо падпісалася звыш трох мільёнаў чалавек.

## КОРАТКА

• Кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства Уладзімір Макей і федэральны міністр па пытаннях Еўропы, інтэграцыі і замежных спраў Аўстрыі Карын Кнайсль учора ўрачыста адкрылі новы офіс пасольства Аўстрыі ў Беларусі.



Фота БелТА.

• **У 2018 годзе ў Беларусі прададзена 52,8 тысячы новых аўтамабіляў, што на 54 % больш, чым у 2017-м.**

• Паводле вестак медыя аб заработнай плаце за лістапад 2018 года, 29,5 % работнікаў у нашай краіне атрымлівалі зарплату вышэй за Br1 тыс.

• **VI Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі плануецца правесці ў Санкт-Пецярбургу з 16 да 18 ліпеня.**

Падпіска-2019

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

## СА «ЗВЯЗДОЙ» ЗБЫВАЮЦЦА МАРЫ

**У кожным жарце ёсць доля... жарту: і сапраўды — выйграць па латарэйным білеце аўтамабіль — прыкладна тое ж, што па чыгуначным — цягнік. То-бок, гэта — вельмі складана! Са звяздоўскімі прызамі ўсё куды прасцей. Да таго ж — ніякіх расходаў (хіба — на канверт)...**

Вы зразумелі: днямі ў рэдакцыі адбыўся традыцыйны розыгрыш прызоў.

Як ён праходзіць, нашым даўнім чытачам нагадваць не трэба, нядаўнім — хіба коратка, «праз коску». Такім чынам кожны, хто аформіў падпіску на «Звязду» на квартал або паўгоддзе, пры жаданні можа запоўніць невялічкую картку-купон (яны друкуюцца на працягу падпісной кампаніі ў пятнічных нумарах) і даслаць на адрас газеты. Тут, у рэдакцыі, усе атрыманыя карткі рэгіструюцца і сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску з тым, каб гарантаваць атрыманне прызоў у кожным рэгіёне краіны.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

А далей, як той казаў, справа тэхнікі: лёс прызоў для падпісчыкаў вырашаць самі падпісчыкі, дзелавыя партнёры газеты — паштавікі, работнікі «Белсаюздруку», адным словам — госці. Гэтым разам сярод іх былі намеснік дырэктара УП «Мінскаблпошта» Алена Ішчук, а таксама пастаянныя чытачы «Звязды» Людміла Сідарэвіч, Іван Астроўскі і Георгій Каралёнак *(на здымку)*.

СТАР. 2

# Найважнейшая задача — палепшыць жыццё людзей

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Беларускі лідар узгадніў прызначэнне на пасаду старшыні Нясвіжскага райвыканкама Аляксандра Ломскага. Да гэтага ён займаў пасаду старшыні Клецкага райвыканкама, якую зараз зойме Анатоль Ладыга.

Старшынёй Пухавіцкага райвыканкама стаў Віктар Каляда, раней ён быў старшынёй Лагойскага райвыканкама.

Таксама кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне на пасаду старшыні Жодзінскага гарвыканкама Дзмітрыя Заблоцкага, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Беларусі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.

Прэзідэнт адзначыў, што асабіста ўважліва назірае за развіццём Мінскай вобласці, бо «гэта палова краіны ў сельскай гаспадарцы і нават прамысловасці». На яго думку, тут не хапае стараннасці і дысцыпліны.

Беларускі лідар зноў нагадаў пра адказнасць за правапарушэнні, не сумяшчальныя са знаходжаннем на дзяржаўнай службе. Так, з Мінскай вобласці за гэта свае месцы страцілі двое. «Карупцыя. Двое знаходзяцца ў месцах, не такіх далёкіх. Ведаеце, я пасля таго як кагосьці затрымліваюць, пачынаю чытаць усякія дзівацтвы, асабліва ў медыйнай прасторы, інтэрнэце, — сказаў Прэзідэнт. — «Ах, вось, добры быў, ды не можа быць, ды не так гэта». Запомніце адну рэч: пакуль на стол мне не пакладуць вычарпальныя факты, ніхто да вас дакрануцца не можа».

Ён папярэдзіў прысутных: калі ёсць канкрэтныя правапарушэнні, асабліва звязаныя з хабарамі, то «множце (пакаранне. — **«Звязда»**) на два як мінімум».

Кіраўнік дзяржавы чарговы раз адзначыў: 2019 і 2020 гады будуць няпростымі, насычанымі палітычнымі падзеямі, калі з усіх бакоў Беларусь будзе падвергнута сур'ёзнай рэвізіі на прадмет нашага суверэнітэту і незалежнасці. Да гэтага неабходна быць гатовым.

«Але запомніце: ніхто нас не ссуне з месца, калі мы будзем працаваць эфектыўна і не пагоршым — як мінімум — жыццё нашых людзей. Беларусы заслужылі нармальнае жыццё, і мы абавязкова павінны, захаваўшы незалежнасць і суверэнітэт, палепшыць жыццё нашых людзей. У адваротным выпадку нікому гэты суверэнітэт не патрэбен будзе. Гэта найважнейшая задача для ўсіх», — дадаў ён.

Таксама беларускі лідар анансаваў свае візіты ў Брэст і Гомельскую вобласць.

### ПРА БРЭСТ ЯК ЗАХОДНІЯ ВАРОТЫ БЕЛАРУСІ

Намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама стаў кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста Генадзь Барысюк. Яго месца зойме Валянцін Мілашэўскі, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Беларусі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што хутка Брэст адзначыць тысячагоддзе. «Брэст трэба дашліфаваць, па-народнаму кажучы. Каб у каралях Беларусі гэта была самая яркая жамчужына. Тым больш, гэта заходнія вароты велізарнага еўразійскага рэгіёна. І людзі, перасякаючы мяжу, павінны бачыць, што яны патрапілі ў іншы выдатны і квітнеючы свет», — сказаў ён.

### ПРА ГОМЕЛЬСКУЮ ВОБЛАСЦЬ І ЧАКАННЕ БОЛЬШАГА

Кіраўнік дзяржавы ўзгадніў прызначэнне на пасаду старшыні Веткаўскага райвыканкама Паўла Сілівончыка, раней — старшыню Нараўлянскага райвыканкама. Яго цяпер ужо папярэднюю пасаду зойме Руслан Смірноў, намеснік старшыні Жлобінскага райвыканкама.

На пасаду старшыні Рагачоўскага райвыканкама ўзгоднены Віталь Сушко, які да гэтага працаваў у якасці першага намесніка старшыні, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання гэтага райвыканкама.

«Гомельская вобласць, скажу вам шчыра, мяне не ўражвае ў апошнія гады. Я ўжо губернатару пра гэта казаў. Магілёўскую і Гомельскую вобласці летась і на працягу першай паловы гэтага года мы вельмі ўважліва рэвізуем. Мы будзем іх глядзець на прадмет дзеяздольнасці кіраўніцтва. Вынікі будуць падведзеныя за мінулы год. Паглядзім, на што выйшла Гомельская вобласць, — адзначыў Прэзідэнт. — Час выпрабаванняў, эксперыментаў і іншага даўно скончыўся і гамяльчане павінны не адставаць у сваім развіцці ад іншых абласцей».

Ён звярнуў увагу, што для Гомельскай вобласці было зроблена больш, чым для любой іншай. Паводле слоў Прэзідэнта, час аддаваць даўгі.

### ТРАНСПАРТ У ТРАНЗІТНАЙ КРАІНЕ

Міністрам транспарту і камунікацый прызначаны Аляксей Аўраменка.

Звяртаючыся да навапечанага міністра, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго патрабаваннем было, каб да кандыдатуры Аляксея Аўраменкі паставіліся вельмі сур'ёзна, вывучылі альтэрнатыўныя варыянты, але ў выніку спыніліся на ім.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: нягледзячы на тое, што Анатоль Сівак, які раней быў міністрам, стаў старшынёй Мінскага гарвыканкама і заняў вельмі важную пасаду для краіны, не трэба думаць, што ў міністэрстве няма праблем. Аляксею Аўраменку, лічыць Аляксандр Лукашэнка, належыць усе гэтыя моманты зняць.

«Паколькі мы краіна транзітная, ад вас шмат што залежыць, — падкрэсліў ён. — І ад аўтамабільнага транспарту, і ад чыгуначнага, паветранага, воднага і гэтак далей. Трэба вызначыцца, нарэшце, у якой частцы нам патрэбны водны транспарт, а ў якой частцы ён вельмі затратны. Трэба ўсе гэтыя пытанні праштудзіраваць і дакладна так, як па Міністэрстве энергетыкі, прарэвізаваць Міністэрства транспарту. Паглядзець і на структуру, і на кадры, на ўсе пытанні».

### БЫЦЬ ПРЫНЦЫПОВЫМ, ЗНАЙСЦІ АГУЛЬНУЮ МОВУ

Старшынёй Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі прызначаны Валянцін Татарыцкі, які да гэтага займаў пасаду першага намесніка старшыні. На думку беларускага лідара, роля гэтага камітэта будзе пастаянна ўзрастаць. «Хацелася б, каб вы былі прынцыповым чалавекам і камітэт быў на адпаведным узроўні», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектарам па Гродзенскай вобласці прызначаны Іван Лаўрыновіч. Раней ён з'яўляўся старшынёй Лёзненскага райвыканкама.

«Я добра ведаю ваш раён і шмат чуў аб вашай рабоце, — сказаў яму кіраўнік дзяржавы. — Вы чалавек вопытны, і гэта было маё рашэнне накіраваць вас у Гродзенскую вобласць. Вы разумееце, што гэта няпростая вобласць, што гэта высокаразвітая ў сельскагаспадарчай сферы вобласць».

Беларускі лідар выказаў надзею, што Лаўрыновіч знойдзе агульную мову са старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам Краўцовым. Пры гэтым ён дадаў, што ў інспектара павінен быць свой погляд на кадры ў рэгіёне.

### БЫЛО Б ЖАДАННЕ — А МЫ АДКРЫТЫЯ

Новым Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Літоўскай Рэспубліцы стаў Валерый Бараноўскі, які раней займаў пасаду начальніка ўпраўлення знешняй палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей адзначыў, што ў Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый Бараноўскі здабыў салідны вопыт, а яшчэ вельмі важна, што раней ён працаваў саветнікам-пасланнікам у Літве. Ён знаёмы з сітуацыяй у краіне, ведае многіх людзей, у сувязі з чым можа змяніць нашы адносіны ў лепшы бок.

Уладзімір Макей звярнуў увагу на тое, што гэтыя адносіны сёння палітызаваны з-за будаўніцтва на беларускай тэрыторыі атамнай станцыі, але гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва працягваецца і расце.

Прэзідэнт адзначыў, што калі Літва хоча з намі супрацоўнічаць, Беларусь адкрыта для гэтага, але калі не хоча, то ў нашай краіны ёсць маса іншых варыянтаў. Напрыклад, ёсць адносіны з Латвіяй.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: ніякай небяспекі наша станцыя для Літвы не ўяўляе. Звяртаючыся да Валерыя Бараноўскага, беларускі лідар заклікаў рабіць усё празрыста, не прагінацца ні пад каго.

Таксама быў прызначаны новы Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Французскай Рэспубліцы і па сумяшчальніцтве Пастаянны прадстаўнік нашай краіны пры ЮНЕСКА — ім стаў Ігар Фісенка, які займаў пасаду начальніка галоўнага консульскага ўпраўлення Міністэрства замежных спраў.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што папярэдні пасол у Францыі — Павел Латушка — быў прыкметны. Паводле яго слоў, у адносінах Беларусі і Францыі важная перш за ўсё эканоміка. Ці зможа нешта дадаць новы пасол? Зможа, упэўнены Уладзімір Макей. Ён ахарактарызаваў яго як уедлівага і скрупулёзнага спецыяліста, які дакладна выконвае ўсе даручэнні. Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, пастаўкі тэхнікі, супрацоўніцтва з дыяспарай — кірункаў работы шмат.

### БЕЗ СЛЯПОГА КАПІЯВАННЯ

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка ўзгадніў прызначэнне першага прарэктара дзяржаўнай установы вышэйшай прафесійнай адукацыі «Беларуска-Расійскі ўніверсітэт» Міхаіла Лусцянкова на пасаду рэктара.

На думку Прэзідэнта, неабходна рыхтаваць студэнта як і раней — чатыры ці пяць гадоў. Ён звярнуў увагу, што ў магістратуру павінны ісці пераважна людзі, якія будуць займацца навукай і выкладаннем. Неабходна праверыць праграмы магістрантаў. Сітуацыя знаходзіцца на кантролі Адміністрацыі Прэзідэнта. Дарэчы, беларускі лідар заклікаў рэанімаваць і прывесці ў нармальны выгляд школьныя праграмы і праграмы ВНУ.

Акрамя таго, на пасаду намесніка міністра эканомікі Беларусі была ўзгоднена Алена Пермінава, раней — начальнік галоўнага ўпраўлення інвестыцыйнай палітыкі Міністэрства эканомікі.

Ваенны камісар Віцебскай вобласці Руслан Шкодзін стаў членам Віцебскага аблвыканкама.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# МАЙСТРЫ СВАЁЙ СПРАВЫ

## У Гродне 20-ы раз уручылі прэмію імя Аляксандра Дубко

**За гэты час лаўрэатамі стала больш за 200 чалавек. Сёлета павялічылася і колькасць пераможцаў. Калі напачатку было дзевяць чалавек, то зараз прызнанне атрымалі 14 прадстаўнікоў творчых прафесій — музыкантаў, артыстаў, пісьменнікаў, мастакоў, журналістаў... Многія з іх прадэманстравалі свае творчыя работы перад пачаткам цырымоніі.**



Фота Мікалая ЛАПІНА.

**Народны майстар з Іўеўскага раёна Вера ЧУРЭЙНА** прэзентавала ўнікальныя вырабы з саломкі. Звяртае на сябе ўвагу незвычайны бусел на доўгіх нагах. У гэтай рабоце Вера Паўлаўна ўпершыню скарыстала асобы стыль укладкі саломкі — у выглядзе плялёсткаў. На згаданую работу спатрэбілася паўтара месяца, прычым жанчына працуе ўвесь дзень, да позняга вечара. Творы майстрыхі пабывалі на выстаўках у Польшчы, Галандыі, ЗША, Расіі, Украіне, краінах Прыбалтыкі. Вера Чурэйна плануе зрабіць калекцыю капелюшоў і пакінуць у спадчыну сваёй малой радзіме.

— Малая радзіма — гэта і ёсць нашы таленавітыя людзі, і мы імі ганарымся, — падкрэсліў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.** — Духоўны пачатак заўсёды меў перавагу ў нашай краіне, у тым ліку і на Гродзеншчыне, і мы захоўваем традыцыі падтрымкі носьбітаў творчасці. Штогод знаходзім новых зорак, якія не толькі самарэалізуюцца, яны радуюць усё грамадства, становяцца прыкладам для моладзі ў адносінах да служэння сваёй зямлі.

У ліку такіх ініцыятыўных людзей — **клубны работнік, кіраўнік узорнай студыі танца Верцялішкаўскага цэнтра культуры Станіслаў МАРОЗАЎ.** Летась ён арганізаваў і правёў найбуйнейшы ў Гродзенскім раёне танцавальны фестываль, на які з'ехалася каля 600 удзельнікаў. Ён лічыць, што базай для цікавых мерапрыемстваў могуць стаць не толькі культурныя ўстановы гарадоў, але і простыя клубы, дзе існуюць аматарскія калектывы, якія любяць сваю творчасць і дэманструюць годны ўзровень.

Нагадаем, што прэмія за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва штогадовага конкурсу ўстаноўлена ў гонар былога старшыні Гродзенскага аблвыканкама, Героя Беларусі Аляксандра Дубко, а цырымонія ўзнагароджвання праходзіць у дзень яго нараджэння. Ва ўрачыстасці традыцыйна прымае ўдзел удава Эма Нічыпараўна Дубко. А сёлета ганаровымі гасцямі абласнога свята сталі ўдзельнікі народнага сямейнага ансамбля «Сваякі» з Ваўкавыскага раёна. Нядаўна калектыў атрымаў званне лаўрэата прэміі Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры «За духоўнае адраджэнне».

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

На паліцу

# Даведнік для спартсменаў і турыстаў

**Даведнікі на рускай і англійскай мовах для дэлегацый усіх краін — удзельніц ІІ Еўрапейскіх гульняў падрыхтавала выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».**




Пад вокладкай сабраныя не толькі галоўныя спартыўныя пляцоўкі нашай краіны, але таксама знакавыя культурныя аб'екты, помнікі архітэктуры і папулярныя турыстычныя мясціны, прычым тэксты і ілюстрацыі дапоўненыя QR-кодамі, якія дапамогуць пазнаёміцца з кожным аб'ектам больш падрабязна.

Як расказаў **дырэктар выдавецтва Уладзімір АНДРЫЕВІЧ,** яшчэ ў 2016 годзе тут выйшлі два тэматычныя фотаальбомы — «Беларусь спартыўная» і «Беларусь алімпійская» (прысвечаны 25-годдзю Нацыянальнага алімпійскага камітэта), а таксама набор паштовак з партрэтамі нашых алімпійцаў і буклет «Алімпійская слава Беларусі». У 2018 годзе ўбачыла свет выданне «Спорт найвышэйшай пробы», якое адкрыла новую кніжную серыю «Беларусь спартыўная». Укладальнікі зборніка расказалі пра алімпійскі рух і ролю спорту ў нашай краіне наогул і Еўрапейскія гульні ў прыватнасці: пра ўдзел беларусаў у гэтым міжнародным форуме і пра тыя беларускія спартыўныя аб'екты сусветнага ўзроўню, дзе ўжо летам гэтага года пройдуць спаборніцтвы.

«Гэта толькі пачатак работы, — падкрэсліў Уладзімір Андрыевіч. — Як турыстычныя даведнікі, так і зборнікі «Спорт найвышэйшай пробы», а таксама насценныя і кішэнныя календары спартыўнай тэматыкі будуць выдадзены дадаткова і паступяць у свабодны продаж напярэдадні і непасрэдна падчас спаборніцтваў — ужо вядуцца адпаведныя перамовы на гэты конт. Цягам наступных пяці-шасці месяцаў выйдуць яшчэ шэраг выданняў, якія будуць не толькі дэманстраваць спартыўныя дасягненні нашай краіны, але ў Год малой радзімы, які працягваецца сёлета, спадзяёмся, змогуць зацікавіць гасцей Беларусі і пакажуць, што нам ёсць чым ганарыцца ў самых розных сферах».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**



# СА «ЗВЯЗДОЙ» ЗБЫВАЮЦЦА МАРЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Менавіта яны, па чарзе, выцягвалі з чароўнага капелюша шчаслівыя купоны, агучвалі прозвішчы будучых уладальнікаў прызоў — з Брэстчыны, Віцебшчыны, Гомельшчыны...

Зразумелае хваляванне ўзнікла, калі чарга дайшла да Мінска, бо Людміла Яўгенаўна, якая выцягвала купон, напэўна ж, хацела б выцягнуць свой (і шанц гэтакі быў). Але... «Каралёнак... Георгій, — зачытала яна прозвішча, і ў Георгія Георгіевіча, які сядзеў амаль што насупраць, у здзіўленні стаў выцягвацца твар... Як і ў іншых прысутных, бо падобных сюрпрызаў, здаецца, яшчэ не было!

**Такім чынам, падарункавы сертыфікат універмага «Беларусь» на суму 100 рублёў выйгралі:**

**Васіль Васілевіч Дударэвіч, в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці;**

**Галіна Уладзіміраўна Ціханенка, г. Чашнікі Віцебскай вобласці;**

**Наталля Віктараўна Пугачэўская, г/п Акцябрскі Гомельскай вобласці;**

**Ірына Канстанцінаўна Кунцэвіч, в. Дубна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці;**

**Ганна Сцяпанаўна Туніловіч, г/п Глуск Магілёўскай вобласці;**

**Леакадзія Канстанцінаўна Балашка, г. Валожын Мінскай вобласці;**

**Георгій Георгіевіч Каралёнак, г. Мінск.**

**Суперпрыз — падарункавы сертыфікат на суму 300 рублёў універмага «Беларусь» — выйграла Любоў Канстанцінаўна Сыраквашка з в. Брадзец Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці.**

...Сярод звяздоўскіх прызоў, на жаль, не кватэры ў сталіцы, не асабнякі на Нарачы (дойдзе, магчыма, і да іх), не аўтамабілі... Гэтым разам — грошы, якія, спадзяёмся, дапамогуць шчаслівчыкам спраўдзіць пэўныя мары, купіць сабе што-небудзь — на добры ўспамін.

Тым жа, каго ўдача абмінула, яшчэ раз скажам: не засмучайцеся, выпісвайце газету, дасылайце карткі. Шанц на выйгрыш заўсёды ёсць. Ва ўсякім разе сярод уладальнікаў сертыфікатаў мы не сустрэлі знаёмых прозвішчаў: усе, здаецца, выйгралі ўпершыню?

Што цікава — дык сярод шчаслівчыкаў аказаліся яшчэ і... мы. Як у анекдоце: жонка на другі дзень Каляд вяртаецца дадому пад раніцу і ў новым футры. «Дзе ўзяла?! — грозна пытае муж. — Накалядавала».

Вось і звяздоўцы ў той дзень сыходзілі з працы з цукеркамі, смачным дамашнім печывам, адмысловымі вершамі... Адна толькі розніца — не мы хадзілі па хатах з віншаваннямі-пажаданнямі, госці (свята ёсць свята!) завіталі да нас.

**Афіцыйна:**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Удалы шопінг са «Звяздой» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

Рэкламная гульня «Удалы шопінг са «Звяздой» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 04.12.2018 г. (пасведчанне № 3440) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 7 снежня 2018 года да 19 лютага 2019 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2019 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 190 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.

Перспектыва

# БАЛАНС ЧЫСТАЙ ЭНЕРГІІ

## Падрыхтаваны праект новага ўказа аб аднаўляльных крыніцах энергіі

**Так званая «зялёная» энергетыка ў апошнія гады развіваецца ў нашай краіне хуткімі тэмпамі. Доля аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ) у валавым аб'ёме паліўна-энергетычных рэсурсаў ужо дасягнула запланаваных да 2020 года 6 %. У спецыялістаў узнікае пытанне — як збалансаваць развіццё ўсіх відаў генерацыі. У Міністэрстве энергетыкі падрыхтавалі прапановы, якія сталі асновай праекта новага ўказа.**



Прапанаваныя змены накіраваны на павышэнне эфектыўнасці выкарыстання «зялёнай» энергіі, зніжэнне фінансавай нагрузкі на спажыўцоў, больш шырокае прымяненне перадавых тэхналогій і захаванне прывабнасці інвестыцый у згаданую сферу.

Урадам будуць прымацца меры па далейшай аптымізацыі кошту аднаўляльнай электраэнергіі, а таксама па забеспячэнні роўных канкурэнтных умоў у гэтай сферы. Якія яшчэ змены чакаюцца, нам расказала **намеснік міністра энергетыкі Вольга ПРУДНІКАВА.**

### ЗАЛАТЫЯ КІЛАВАТЫ

Практыка прымянення закона аб аднаўляльных крыніцах энергіі паказала, што з часам падыходы трэба ўдасканальваць, а аб'екты, якія генерыруюць энергію, павінны развівацца на канкурэнтнай аснове. Калі патрабуецца дзяржпадтрымка, то яна павінна ўлічваць патрэбы эканомікі і краіны ў цэлым, інтарэсы астатніх спажыўцоў.

Сёння сярэдняя цана куплі энергіі ад АКЭ ў пяць разоў вышэйшая, чым кошт энергіі, выпрацаванай на цеплавых электрастанцыях. Але паколькі тэхналогіі патаннелі, стала больш пастаўшчыкоў абсталявання, цана на «зялёную» энергію можа зніжацца. Таму трэба ўпарадкаваць каэфіцыенты, па якіх яна выкупляецца. Замест павышальных плануюць прымяняць павышальныя і стымуляцыйныя каэфіцыенты. Апошнія (іх вызначае Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю) могуць быць і менш за адзінку. Досвед работы з прэтэндэнтамі на стварэнне ўстановак кажа, што новыя ўмовы, якія з'явяцца ў заканадаўстве, іх задавальняюць.



Віцебская ГЭС.

### ТОЛЬКІ НОВАЕ АБСТАЛЯВАННЕ

Раней у заканадаўстве не быў канкрэтызаваны момант, якое абсталяванне дзяржава павінна падтрымліваць. Таму на тэрыторыю краіны пачалі ўвозіць старое абсталяванне з Еўропы. Там перыяд субсідавання таксама ў сярэднім складаў дзесяць гадоў. Уладальнікі такіх установак, каб не займацца іх утылізацыяй, крыху мадэрнізавалі іх і прывозілі да нас.

Цяпер дзяржпадтрымка ў рамках квот будзе толькі на новае абсталяванне. Пры гэтым патрабаванне аб выкарыстанні новага абсталявання не будзе распаўсюджвацца на ўстаноўкі, якія ствараюцца па-за квотамі — выключна для энергетычнага забеспячэння сваёй гаспадарчай дзейнасці.

І яшчэ. Новы праект указа дасць магчымасць уласнікам установак АКЭ перадаваць электраэнергію па дзяржаўных сетках у парадку, які вызначаецца ўрадам краіны. Пытанні перадачы электраэнергіі паміж іншымі юрыдычнымі асобамі пакуль прапрацоўваюцца.

### СТРАТЭГІЧНАЯ ЗАДАЧА

Паколькі Беларуская АЭС будзе выдаваць электраэнергію па роўным графіку, важна пры сутачным планаванні ўлічваць работу «зялёных» установак, каб не дапусціць лішак рэсурсаў. Таму праектам указа прапісана наступная норма: уласнікі такіх установак павінны штодзень інфармаваць аператыўныя дыспетчарскія ўпраўленні аб рэжыме сваёй работы. Гэта правіла аб узаемадзеянні крыніц энергіі раней было прадугледжана і ў канцэпцыі энергетычнай бяспекі і з'яўляецца сусветнай практыкай.

Любая дзяржава, развіваючы аднаўляльную энергетыку, ставіць перад сабой пэўныя задачы, падкрэсліла Вольга Прруднікава. Адны вырашаюць пытанні энергетычнай беднасці, пакрыцця дэфіцыту электрычных магутнасцяў ва ўмовах адсутнасці традыцыйных відаў паліва або высокіх цэн на іх, іншыя — энергазабеспячэння цяжкадаступных рэгіёнаў, дзе няма сеткавай інфраструктуры. Адыгрываюць ролю і кліматычныя пытанні, выкананне Парыжскага пагаднення. Калі казаць аб нашай краіне, то асноўнай задачай з'яўляецца дыверсіфікацыя паліўна-энергетычнага балансу. У перспектыве мы павінны скарачаць аб'ёмы выкарыстання выкапнёвых відаў паліва, гэта нармальная стратэгічная задача, каб доля дамінуючага рэсурсу — прыроднага газу — зніжалася.

Праект указа на цяперашнім этапе знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**У тэму**

Аналіз сучасных тэндэнцый развіцця аднаўляльных крыніц энергіі ў вядучых еўрапейскіх краінах паказвае, што дзяржавы, зацікаўленыя ў шырокамаштабным развіцці гэтай энергетыкі, ствараюць і пастаянна ўдасканальваюць комплекс дзяржаўных стымуляцыйных мер, які ўлічвае і эканамічныя інтарэсы краіны. У выпадку рэзкага прыросту энергіі з АКЭ ўжываецца практыка абмежавання будаўніцтва названых энергакрыніц, частковага або поўнага скарачэння эканамічнага стымулявання іх развіцця.

Напрыклад, у Чэхіі на заканадаўчым узроўні адменена эканамічнае стымуляванне ўсіх «зялёных» установак (за выключэннем міні-ГЭС), уведзеных у эксплуатацыю пасля 2013 года. Для ўстановак, якія працуюць, уведзеныя дадатковыя падаткі.

У Вялікабрытаніі ўрад мае намер з 31 сакавіка 2019 года адмяніць плату за электраэнергію, якую пастаўляюць у сетку малыя сонечныя электрастанцыі, устаноўленыя на будынках (у цяперашні час гэта каля 820 тысяч установак). Патрабаванне будзе дзейнічаць у дачыненні да новых аб'ектаў, якія падключаюцца пасля названага тэрміну. Гэта абумоўлена тым, што энергасістэма тэхнічна не зможа спажыць усю выпрацаваную такімі ўстаноўкамі сонечную электраэнергію згодна з рэжымамі работы. Таму электраэнергія ад такіх установак будзе пастаўляцца ў энергасістэму бясплатна.

Добрыя справы

# Не толькі салодкія падарункі

## Сума дапамогі ў рамках акцыі «Нашы дзеці» склала 1,5 мільёна рублёў

**Дабрачынная акцыя праходзіла з 10 снежня да 11 студзеня. Падчас яе 91 арганізацыя наведала 122 сацыяльна значныя аб'екты: гэта інтэрнатныя ўстановы, дзіцячыя сацыяльныя прытулкі, бальніцы, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы для найлепшых навучэнцаў і студэнтаў. Усяго акцыяй было ахоплена больш за 550 тысяч хлопчыкаў і дзяўчат.**

— Па аператыўнай інфармацыі, дапамога, якая была аказана, складае каля 1,5 мільёна рублёў. Гэта ўжо перавышае суму мінулага года амаль на 300 тысяч рублёў. Але канчатковыя вынікі акцыі яшчэ падлічваюцца, — паведаміла **галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА.**

Яна дадала, што ўстановы, дзе выхоўваюцца дзеці з уразлівых катэгорый, падтрымліваюцца не толькі напярэдадні зімовых свят, але і на працягу года. Напрыклад, Міністэрства лясной гаспадаркі набыло і ўстанавіла вокны Глускай санаторнай школе-інтэрнату, а Міністэрства абароны дапамагло зрабіць рамонт і ўкамплектаваць мэбляй спальны комплекс у Андрэеўскім дзіцячым доме.

— Пачынае ярка праяўляцца традыцыя аказваць усё больш увагі не толькі інтэрнатным установам, але і сем'ям, у якіх выхоўваюцца сіроты, — заўважае Алена Сімакова. — Гэта таксама важна, паколькі сетка дзіцячых інтэрнатных устаноў за апошнія дзесяць гадоў скарацілася напалову, выхаванцаў там стала на 70 працэнтаў менш, а колькасць дзяцей у дамах сямейнага тыпу вырасла ў два разы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# ДЭКОР, ЯШЧЭ ДЭКОР...

## Стары замак у Гродне пачалі ўпрыгожваць скульптурна-мастацкімі элементамі

**У хуткім часе на ўязной арцы з'явіцца барэльеф анёла з крыламі. Масіўны дэкор напрыканцы мінулага года пачалі вырабляць на Гродзенскім заводзе па перапрацоўцы каменя. Частка кесонаў ужо змантавана. Аздабленне вядзецца паралельна з будаўніцтвам першай чаргі каралеўскага палаца.**

### Анёл вагой у паўтоны

Да аднаўлення замка падключыліся майстры па камені і скульптары. Спецыяльная брыгада створана на Гродзенскім заводзе па перапрацоўцы каменю. Адказны заказ трапіў на найбуйнейшае ў сваёй галіне прадпрыемства вобласці.

Цяпер змантаваны партал з боку аркі, зроблены парапеты пад дахам і балюстрадай. І гэта толькі пачатак маштабных работ па дэкарыраванні палаца, адзначаюць на прадпрыемстве.

Працэс даволі працаёмкі. Як расказаў гродзенскі скульптар Уладзімір Панцялееў, на падрыхтоўку толькі аднаго кесона, памерам 60х60 сантыметраў, патрэбна каля 10 дзён. Кожны элемент — гэта індывідуальная работа.

Зараз ужо гатовыя дэкоры з кветак, гронак вінаграду, галавы льва. Элементы даволі масіўныя — кожны важыць не менш за 200 кілаграмаў. А галава анёла з крыламі — удвая больш. Гэта скульптура зойме сваё пачэснае месца ў цэнтры аркі. Дарэчы, увесь дэкор робіцца ў адпаведнасці з гістарычным воблікам палаца часоў Стафана Баторыя. З такога самага пясчаніку, што ўпрыгожваў замак у XVI стагоддзі. Пошукі радовішча занялі шмат часу, адзначыў **навуковы кіраўнік праекта Алег ШЫМБАРЭЦКІ.** І нарэшце знайшлі падобны пясчанік у Польшчы, непадалёку ад Варшавы.

Блокі адтуль паступаюць трох колераў — белыя, шэра-зялёныя і бледна-чырвоныя. На тыдзень завод прымае некалькі фураў з 20 тонамі пясчаніку. Пакуль зроблена 10 кесонаў — архітэктурных элементаў для арак. Усе яны змантаваны. Да канца студзеня тут мяркуюць поўнасцю аздобіць уязную арку. А ўвогуле работы па дэкоры значна даўжэйшыя, бо ім упрыгожаць як вонкавы, так і унутраны аб'ем замка. А ён, як вядома, узводзіўся з уласцівым для каралеўскага палаца размахам.

### У пошуках страчанага

Стары замак — адзіная каралеўская рэзідэнцыя, якая захавалася ў Беларусі. Таму і было вырашана аднавіць замак у такім выглядзе, які ён быў падчас кіравання караля Стафана Баторыя. У свой час кароль зрабіў палац сваёй рэзідэнцыяй і з дапамогай архітэктара Санта Гучы надаў яму раскошны выгляд. Але да нашага часу замак дайшоў без былой веліччы. Пасля рэканструкцыі ён зноў набудзе рысы каралеўскага палаца XVI стагоддзя.

Вось ужо больш як год тут вядуцца работы. І разам з гэтым не сціхаюць спрэчкі вакол гістарычнага аб'екта. Да дыскусіі падключыліся і нашы суседзі-палякі. Экспертная група на чале з кіраўніцтвам міністэрства культуры не так даўно пабывала на будоўлі і нават вынесла свой вердыкт — рэканструкцыя адпавядае аўтэнтычнаму выгляду.



А вось унутраны праект пакуль не вызначаны. Гэта звязана не толькі з вялікім аб'ёмам работы па ўзнаўленні сцен, але і з адсутнасцю поўнай карціны гістарычных матэрыялаў па размяшчэнні пакояў замка. Такая блытаніна звязана з інвентарнымі дакументамі. І хоць іх даволі шмат — 10—12 тамоў, сустракаюцца супярэчлівыя звесткі па размяшчэнні тых жа пакояў. Напрыклад, цяпер вядуцца спрэчкі, у якім з іх кароль правёў апошнія дні свайго жыцця.



— Есць эскізны праект рэканструкцыі Старога замка 80-х гадоў, які зрабіў мінскі архітэктар Бачкоў. І яго праект не разыходзіцца з гістарычным інвентарным планам. Новыя інтэрпрэтацыі выклікаюць пытанні, — зазначае Алег Шымбарэцкі. — У канчатковым выглядзе гэты план існуе, і, згодна з ім, у праект Бачкова ўносяцца карэктывы. Напрыклад, спальня Баторыя магла знаходзіцца ў іншым месцы.

Асобы, якія рабілі інвентарызацыю, часцей за ўсё звярталі ўвагу на нейкія праблемы, якія існавалі ў пакоі. Напрыклад, рыпелі дзверы альбо не працаваў замок... У такіх выпадках гэты пакой адзначаўся ў дакументах. Калі ўсё добра, пакой маглі і не ўпісваць у план. Таму гэтае пытанне не столькі пра з'яўленне новых звестак, колькі пра іх інтэрпрэтацыі, лічыць Алег Шымбарэцкі.

— У каралеўскіх замках праходзіла інвентарызацыя перад прыездам караля, напярэдадні важных падзей альбо пасля разбурэння. Так і ў Старым замку было некалькі такіх інвентарных перыядаў, звесткі пра якія дайшлі да нашых часоў. Але трэба разумець, што пісары больш зазначалі тыя моманты, якія патрабавалі нейкага паляпшэння стану будынка, рамонту. І часцей за ўсё не звярталі ўвагі на мастацкія асаблівасці пакояў, наяўнасць нейкіх каштоўных рэчаў. Іх задача была — скласці каштарыс для рамонту, — рэзюмуе Алег Уладзіміравіч.

Пакуль ідзе рэканструкцыя першай чаргі, гісторыкі, археолагі і праектанты шукаюць кампраміс. Галоўнае, каб гэтыя спрэчкі не сталі тормазам у аднаўленні. Дастаткова прыгадаць, што рэканструкцыя палаца з-за праектных спрэчак і так зацягнулася на дзесяцігоддзі.

### Таямніца пад камяніцай

Сёння тэрыторыя замка — гэта не толькі маштабная будоўля. Тут вядуцца археалагічныя раскопкі, якія значна папоўнілі экспазіцыю гісторыка-археалагічнага музея. Дарэчы, ён месціцца якраз у Старым замку.

Літаральна нядаўна, ужо ў новым годзе, знойдзена чарговая шахматная фігура XIII стагоддзя. Гэта драўляная пешка, на якой бачны знак Сонца — кола са спіцамі. Гэта знаходка стала ўжо чацвёртай у так званай партыі Замкавай гары. Разам з трыма шахматнымі фігурамі — ладдзёй і дзвюма пешкамі, знойдзены і фрагмент шахматнай дошкі.

Нядаўна археолагі раскапалі касцяныя пласціны, якія ўпрыгожвалі сядло. Прадметы адлюстроўваюць быт жыхароў гэтых зямель канца XIV стагоддзя. Гэта — кераміка, рэшткі скураных вырабаў — рамянёў і абутку. Знойдзены бронзавы пярсцёнак і завушніца.

Сапраўднай сенсацыяй сталі рэшткі сцяны часоў Вітаўта. Яе выявілі падчас пракладкі цеплатрасы. Адкрыта каля 20 старажытных драўляных пабудоў. Усе спілы адпраўлены на даследаванні ў сталіцу. Многія ўжо вызначаны па даце — гэта XIV—XV стагоддзі.

Раскопкі вядуцца на той частцы гары, дзе некалі была камяніца — гаспадарчая пабудова часоў каралеўскай рэзідэнцыі. На месцы раскопак плануецца стварэнне музейнай экспазіцыі. І гэта будзе наступным этапам рэканструкцыі. Першы, самы складаны этап, завершыць узвядзенне аркі, сярэдняй вежы, галерэі і сцяны над Нёманам.

— Кожны ўзровень патрабуе свайго асаблівага падыходу, а вопыт рэканструкцыі такога аб'екта пакуль не напрацаваны, — адзначае Алег Шымбарэцкі, — прыходзіцца літаральна паказваць, куды класці цэглу. Гэта замаруджвае ход работ.

Таксама шмат часу патрабуе пошук патрэбных будаўнічых матэрыялаў — керамічнай пліткі, той жа цэглы... Выбар іх сярод мясцовых прадпрыемстваў даволі нізкі, таму прыходзіцца шукаць за межамі краіны. А між тым, часу застаецца ўсё менш. Першую чаргу рэканструкцыі намечана завяршыць на будучы год.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

---

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

ГЛУША Адамовіча

# ЖЫВЫЯ СТАРОНКІ

Так шмат ужо напісана пра музей Адамовіча ў Глушы, што калі б з літарак можна было скласці будынак, ён, напэўна, атрымаўся б на некалькі паверхаў. Але ні мы, ні чытачы не губляем надзеі, што ён будзе. Вось і чарговы званок таму пацвярджэнне. «Гэта Мікалай Якаўлевіч Карповіч, — прагучала ў тэлефоннай трубцы. — Я — ураджэнец Глушы, але зараз жыву ў Віцебску. Хачу падзякаваць газеце за такі цудоўны праект. Малайцы, што падымаеце гэтую тэму. Музей павінен быць. Ён стане ўшанаваннем памяці для ўсіх глушанцаў».

Калі чалавек за некалькі дзён да Новага года думае пра будучае музея ў маленькай Глушы, напэўна, гэта сапраўды важна.

### ТАЯ САМАЯ АПТЭКА

Пакуль размаўлялі з Мікалаем Якаўлевічам, высветлілася, што ён сям'ю Адамовічаў ведае не па кніжках.

— Я 1937-га года нараджэння, жывы сведка гісторыі пасёлка. Бацька Алеся Адамовіча быў урачом, а я часта хварэў, і ён мяне ратаваў. Мая старэйшая сястра Любоў Якаўлеўна, а нас у сям'і было пяцёра, падчас вайны працавала ў аптэцы, разам з маці Алеся Адамовіча — Ганнай Мітрафанаўнай. Яшчэ адна сястра Алена была сувязной партызанскага атрада. Яе выдаў сусед-паліцай. Дзве мае сястры прайшлі канцлагер — адна Асвенцім, другая Бухенвальд. Трэцюю таксама хацелі сагнаць у Германію, але гэтаму перашкодзілі бабруйскія падпольшчыкі.

Мікалай Якаўлевіч збіраецца перадаць будучаму музею ўспаміны сваёй старэйшай сястры і ўсе яе ўзнагароды, у тым ліку памятны медаль вязня Асвенціма. Яна была выдатнікам народнай асветы, вяла актыўнае грамадскае жыццё. У архіве Карповіча захаваліся артыкулы пра жыхароў пасёлка, якія таксама шмат чаго могуць расказаць пра мінулае. «Збіраюся сёлета з'ездзіць у Глушу на сустрэчу выпускнікоў, — падзяліўся ён сваімі планамі. — Школу скончыў у 1955 годзе, шмат цёплых успамінаў засталося. У нас былі вельмі моцныя матэматыкі, і мне прывілі любоў да гэтага прадмета. Дзякуючы яму ў мяне і сёння цудоўная памяць. Добра памятаю сваё дзяцінства, вайну».

### АПОШНІЯ СВЕДКІ З РАМАНА

Успомнілася таксама, як у адну з апошніх маіх паездак у Глушу сустрэліся мы з Зінаідай Гарнастай, дачкой героя адамовіцкай дылогіі «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой» — падпольшчыка Лісіцына, у жыцці Івана Рыгоравіча Гарнастая. Дачка доўга расказвала пра тыя жахлівыя гісторыі, якія перажыў у першы год вайны яе бацька. Як ён пайшоў на фронт, як трапіў у палон, як спрабаваў збегчы. Аднойчы ў яго гэта атрымалася. Пешшу ішоў болей месяца з Украіны. Зранены, знямоглы, але ж дабраўся. А калі крыху падлячыўся, заняўся падпольнай работай у тыле ворага. З яго дапамогай было здзейснена шмат дыверсій.

Яшчэ адзін прататып — дзед Ляшчун, у кнізе — Лясун. «Жыў да вайны ў Навінках на хутары, быў сувязны, вывозіў на кані сем'і партызан у лес, — прыгадвае Зінаіда Іванаўна героя. — Памятаеце эпізод, калі стары, каб зайсці ў аптэку і перадаць інфармацыю ад партызан, паваліўся на зямлю і енчыў, быццам ад болю ў жываце? І немцы паверылі, што ў яго прыступ. Вось гэта ён і ёсць. Вельмі хітры быў стары. У яго засталіся дзве дачкі, але жывыя яны ці не, я нават не ведаю.

Ёсць у творах Адамовіча і не вельмі станоўчыя прыклады паводзін тутэйшых жыхароў. І хоць пісьменнік адкрыта не ўказваў на іх, яны самі сябе пазнавалі. Зінаіда Гарнастай успамінае, як аднойчы яе выклікалі ў сельсавет па адной скарзе. Адзін з пазнаўшых сябе напісаў ліст уладам, што Адамовіч не заслугоўвае таго, каб яго памяць увекавечылі. Напісаў, што ён абгаварыў яго — чэснага чалавека. Прыехала шмат правяраючых, высвятлялі, што і як, але скарга не пацвердзілася.

— Адамовіч у рамане практычна ўсіх глушанцаў згадаў, але тых людзей ужо і на свеце няма, — уздыхае Зінаіда Іванаўна. — І нават іх дзеці або раз'ехаліся, або паўміралі. Сёння некаторыя жыхары нават і не ведаюць, хто такі Алесь Адамовіч і якое ён мае дачыненне да Глушы. Ужо тры пакаленні з тых часоў змянілася. Ды і прыезджых стала шмат.

### ДЫК ШТО ТАМ, З МУЗЕЕМ?

Пра музей гаворка ішла яшчэ падчас пахавання пісьменніка ў Глушы. Сёлета, дарэчы, спаўняецца чвэрць стагоддзя з таго маманту. Летась, дзякуючы ініцыятыве бабруйскага актывіста Андруся Архіпенкі, у пасёлку з'явіўся арт-прыпынак, прысвечаны Адамовічу, і былі сабраныя грошы на помнік пісьменніку. Плануецца, што ён будзе ўстаноўлены сёлета. У Бабруйскім райвыканкаме вітаюць яшчэ адну ініцыятыву Андруся — стварыць грамадскую маладзёжную арганізацыю, якая зможа ўзяць на сябе абавязкі па рэканструкцыі будынка аптэкі пад музей.

— Зараз мы вывучаем юрыдычныя нюансы. Будзем удзячны, калі неабходныя спецыялісты ў гэтым пытанні далучацца да нас. Трэба вызначыцца, колькі грошай спатрэбіцца на праектна-каштарысную дакументацыю. Шукаем архітэктара, які зможа даць парады, моладзь, якая актыўнічае ў сацыяльных сетках і зможа прасоўваць нашы планы праз інтэрнэт. Мяркуем стварыць у Глушы такі музей, які стане адначасова культурна-грамадскім цэнтрам па развіцці пасёлка, месцам сустрэч творчай моладзі.

20 студзеня Андрусь са сваімі сябрамі плануе сабрацца ў антыкаварні ў Бабруйску і запрасіць усіх, каму неабыякавы лёс музея Алеся Адамовіча. Наталля Адамовіч ужо атрымала запрашэнне на гэтую сустрэчу.

— Мне вельмі прыемна, што ў Бабруйску з'явілася суполка маладых людзей, якім цікава не толькі творчасць, але і справа ўвекавечання памяці Алеся Адамовіча. Дзякуй ім за неабыякавае стаўленне да майго бацькі, — прызнаецца яна.

Наталля Адамовіч атрымала запрашэнне яшчэ на адно мерапрыемства, звязанае з імем яе бацькі. Сёлета ў Расіі ўрачыста адзначаецца 100-годдзе з дня нараджэння вядомага расійскага пісьменніка Данііла Граніна і 40-годдзе з моманту першага выдання «Блакаднай кнігі», напісанай ім у суаўтарстве з Алесем Адамовічам. У верасні — месяцы, калі пачалася блакада, у Санкт-Пецярбургу адбудзецца канферэнцыя-выстаўка, прысвечаная юбілейным датам. А летась «Блакадная кніга» была перавыдадзеная ў Германіі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Збор сродкаў на музей працягваецца. Далучыцца да добрай справы можаце і вы. Разліковы рахунак існуе пры аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бабруйскага райвыканкама р/р BY84AKBB36421292723267100000 у філіяле 703 ААТ «ААБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21703, УНП 701226324.**

**Прызначэнне плацяжу: «Для вырабу праектна-каштарыснай дакументацыі і рэканструкцыі будынка ў пасёлку Глуша пад музей А. Адамовіча». Гэты доўгі сказ павінен быць пазначаны ў банкаўскім дакуменце абавязкова.**

---

Педагогіка + філасофія

# «Настаўнік без характару, што соль без смаку»

**Аднойчы індыйскі лідар Махатма Гандзі садзіўся ў цягнік. Адна з яго сандаляў зляцела з нагі і ўпала на зямлю. Цягнік ужо пачынаў рух, і не было ніякай магчымасці падняць яе. Тады Гандзі, не раздумваючы, скінуў на зямлю і другую сандалю. На пытанне сябра пра свой учынак ён адказаў, што адна сандаля не прынясе яму ніякай карысці, а дзве сандалі абавязкова каму-небудзь спатрэбяцца. Гэту гісторыю прыводзіць на старонках сваёй кнігі «Мудрасць будучыні» гарвардскі прафесар Дэвід Перкінс. Часцей за ўсё яе ўспрымаюць як прыклад шчодрасці, але насамрэч яна пра іншае — пра разуменне таго, што трэба людзям, і пра ўменне хутка знаходзіць правільнае рашэнне...**

### МІСІЯ — ЗЛУЧАЦЬ ПАКАЛЕННІ

Мінулай восенню ў Мінску на тэрыторыі Лошыцкага сядзібна-паркавага комплексу прайшла ўрачыстая цырымонія пасадкі дрэў, прымеркаваная да 150-годдзя з дня нараджэння выдатнага індыйскага палітычнага і грамадскага дзеяча, чалавека свету Махатмы Гандзі. Яго філасофія ненасілля аказала значны ўплыў на рух прыхільнікаў мірных перамен. Але Махатма Гандзі быў яшчэ і выдатным педагогам, які сцвярджаў, што ў адукацыі заключаецца адзіна магчымы шлях негвалтоўнага змянення свету. Яго педагагічная спадчына складае больш за 400 крыніц, сярод якіх восем кніг, буквар, сотні артыкулаў і публічных выступленняў.

«Адукацыя можа даць вынікі, якіх нельга дасягнуць прымяненнем любой сілы», — лічыў Гандзі. Сімвалічна, што помнік яму некалькі гадоў таму з'явіўся ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе стаў першым манументам у галерэі вядомых дзеячаў сусветнай палітыкі і навукі.

Арыгінальная і самабытная педагогіка Гандзі з'яўляецца шмат у чым аўтарскай, яна арыентаваная на агульначалавечыя каштоўнасці, што прадвызначае іх вечную актуальнасць. Першая місія адукацыі — злучаць пакаленні, перадаваць назапашаны стагоддзямі вопыт, забяспечваць пераемнасць у развіцці культуры і цывілізацыі. Гандзі лічыў, што з гэтай функцыяй цалкам спраўлялася традыцыйная сістэма адукацыі Індыі. А вось парушэнне пераемнасці развіцця можа прывесці да «трансплантацыі» на нацыянальную глебу чужой сістэмы каштоўнасцяў і прынцыпаў.



На думку Гандзі, важную ролю адукацыя мае і для забеспячэння паступальнага і прагрэсіўнага развіцця краіны. Старанна ўлоўліваючы змены, прадыктаваныя жыццём, яна павінна рыхтаваць да перамен людзей і дапамагаць ім прымаць правільныя рашэнні.

> **«Галоўная праблема адукацыі не столькі ў тым, каб вырашыць, чаму і як вучыць, колькі ў тым, дзе ўзяць добрых настаўнікаў».**

У лютым 1926 года для педагагічнага дадатку газеты «Наваджыван» Гандзі напісаў артыкул «Што такое адукацыя?» Адказваючы на пастаўленае ў загалоўку пытанне, ён выказаў думку, што этымалагічна англійскае слова «education» азначае «выцягванне вонкі», маючы на ўвазе спробу развіцця схаваных талентаў. Галоўная мэта ўсяго адукацыйнага працэсу — «прыкласці намаганні, каб дастаць усё самае лепшае, што ёсць у навучэнцаў, звяртаючыся да іх сэрцаў і розуму». Пры гэтым асноўная роля адводзілася фарміраванню маральнага стрыжня. «На вучнях ляжыць, мабыць, самая вялікая адказнасць. Будучыня залежыць ад іх жадання, сумленнасці, стараннасці і патрыятызму. Настаўнікі не могуць даць таго, чаго няма ў вучняў, а могуць толькі дапамагчы «выцягнуць вонкі» тое, што ў іх ёсць.

### ЯКІЯ ВЕДЫ НАЙБОЛЬШ КАШТОЎНЫЯ?

Асаблівую ўвагу хочацца звярнуць на разуменне Гандзі вынікаў адукацыйнай дзейнасці — тое, што ў сучаснай педагогіцы называюць кампетэнтнасным падыходам, калі на змену «ведам, уменням, навыкам» прыходзяць кампетэнцыі...

Махатма Гандзі пісаў: «Веды, атрыманыя праз вопыт, куды больш каштоўныя і нашмат больш карысныя, чым кніжныя. Наконт гэтага ў мяне няма сумненняў». Акрамя таго, да вынікаў адукацыйнай дзейнасці Гандзі адносіў дасягненне пэўнага (пажадана высокага) узроўню сфарміраванасці маральнага характару ў чалавека (сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі), дастатковага ўзроўню авалодання мастацтвам карміць сябе (гэта значыць, самастойна зарабляць сабе на жыццё). А таксама «быць упэўненым у сабе» (што прадугледжвала ўменне самому забяспечваць задавальненне сваіх патрэб, каб ні ад каго не залежаць). Гандзі выказаўся і за неабходнасць пашырэння часавых рамак мэтанакіраванай адукацыі. Такім чынам, намнога апярэдзіўшы час, менавіта Гандзі першы сфармуляваў актуальную і агульнапрызнаную сёння канцэпцыю «адукацыі праз усё жыццё».

Ён неаднаразова падкрэсліваў, што галоўная праблема адукацыі не столькі ў тым, каб вырашыць, чаму і як вучыць, колькі ў тым, дзе ўзяць добрых настаўнікаў, каб ажыццявіць задуманае на практыцы. Такім чынам, у цэнтры педагагічнай сістэмы Гандзі стаіць педагог. У адным са сваіх артыкулаў ён пісаў: «Палітык можа дасягнуць сваёй мэты, нават калі ў яго і няма характару, але народны настаўнік не можа абысціся без характару. Настаўнік без характару, што соль без смаку». Цікава, што яшчэ ў старажытнай Індыі адрознівалі тры катэгорыі педагогаў: выкладчык, які транслюе веды, настаўнік, які навучае і выхоўвае, і гуру (педагог самага высокага рангу).

> **Што пакінуць, а ад чаго адмовіцца? Вось галоўныя пытанні, на якія мы павінны знайсці адказ.**

### КАБ СВЕТ НЕ АСЛЕП

Наведваючы мемарыял Махатмы Гандзі ў Нью-Дэлі, Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш назваў яго «найвялікшай» асобай. «Міжнародны дзень ненасілля (2 кастрычніка — Дзень нараджэння Махатмы Гандзі) — гэта даніна памяці найвялікшаму чалавеку з усіх, якія жылі на Зямлі, — падкрэсліў кіраўнік ААН. — На пасадзе Генеральнага сакратара я магу толькі спадзявацца, што ўсе, хто надзелены палітычнай уладай, змогуць падняцца да ўзроўню Махатмы Гандзі і зразумець, што дасягнуць мэты можна шляхам дыялогу, захоўваючы прыхільнасць праўдзе і дзейнічаючы ў інтарэсах іншых. Гандзі даказаў, што «ненасілле можа змяніць ход гісторыі».

Напрыканцы прапаную прыгадаць гісторыю аб цягніку і сандалі Махатма Гандзі. Што пакінуць, а ад чаго адмовіцца? Вось галоўныя пытанні, на якія мы павінны знайсці адказ, калі выбіраем сённяшнім навучэнцам і студэнтам «сандалі», патрэбныя ім для падарожжа ў будучыню. Устаноўку індыйскага педагагічнага Гуру — «жыць правільна, думаць правільна, рабіць правільна» — складана пераацаніць, як і яго перасцярогу, што прынцып «вока за вока» можа зрабіць увесь свет сляпым.

**Ігар ГАНЧАРОНАК,**
**прафесар, старшыня праўлення Таварыства дружбы «Беларусь — Індыя».**

---

# «Прыязджайце дадому»: кніга выбранай паэзіі Генадзя Бураўкіна

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» прадаўжае серыю кніг «100 вершаў».**

Праект нарадзіўся невыпадкова. Чытачы, бібліятэкары звяртаюць увагу на тое, што часам сёння кнігі паэзіі выходзяць вялікімі фаліянтамі. Здараецца, у некалькі соцень старонак. Сустракаючы такое выданне, задумваешся, а ці будзе чытаць сучаснік такі збор вершаў як раман. Паэзія — заўсёды вобразы, параўнанні, адзіны радок...

— Вось мы і задумаліся, што і як зрабіць, каб вярнуць увагу чытача да паэзіі, — тлумачыць **дырэктар «Мастацкай літаратуры» Алесь БАДАК.** — І прыйшлі да такой высновы, што і ў вялікага, знакамітага і, магчыма, меней вядомага паэта можна выбраць сто самых лепшых вершаў і выдаць адной невялікай кнігай. Так склалася серыя «100 вершаў». Часам нам падказваюць кнігарні, бібліятэкі, каго перш-наперш выдаць. Часам мы арыентуемся на меркаванні літаратурнай грамадскасці. У выніку, пачынаючы з 2017 года, выдалі пяць кніг. Адзін калектыўны зборнік паэзіі прысвяцілі вершам пра малую радзіму. Аўтары іншых збораў, дзе пастараліся выбраць самае лепшае са спадчыны паэтаў, — Міхась Стральцоў, Яўгенія Янішчыц, Пімен Панчанка. Цяпер вось — «Ніці лёсу» Генадзя Бураўкіна.

«Ці то раніцай звонкай, / Ці то вечарам ціхім — / Прыязджайце дадому, / Прыязджайце дадому / На сустрэчу / З яшчэ не забытым дзяцінствам, / Дзе матуля / Калыску люляла малому...» Гэтыя радкі верша «Прыязджайце дадому» нарадзіліся пасля знаёмства чытача са знакамітым вершам Рыгора Барадуліна — і ў эпіграф нават Генадзь Бураўкін вынес: «Трэба дома бываць часцей...» Многія творы аўтара кнігі «Ніці лёсу», якую ўклаў чуйны да паэтычнага слова Віктар Шніп, — гэта добра вядомыя беларусам песні. «Снежная імпрэсія» — гэта ж «Завіруха» («Ты куды мяне клічаш, / паслухай? — / На дварэ ні машын, ні людзей. / Белы снег, / Белы цень, / Белы дзень...» А хіба вы не ведаеце на памяць з маленства вось гэтыя словы: «Доўгі дзень, / Цёплы дзень / Адплывае за аблокі. / Сіні цень, / Сонны цень / Адпаўзае ў кут далёкі. / Збеглі зайкі ўсе ў лясы...» ?.. Вядома ж, «Калыханка»!.. Не песня, а цэлы драматычны спектакль, які можна ўяўляць у любое надвор'е, у любую пару года. Бо ў вершы «спяць і мышкі, і стрыжы. / Спяць машыны ў гаражы», а толькі не спяць словы, ствараючы вобразныя карціны, узбагачаючы нашы ўяўленні дзеямі, насычаючы паветра вакол нас сняжынкамі. І нясецца, выбіваючы капытамі галасы прыроды, «Конь незацугляны». Упэўнена нагадвае пра спаконвечнае «Малітва» («Божа, / Захіні маю Радзіму / Мудрасцю, / Спакоем / І цяплом!»)...

«Ніці лёсу» — выдатны напамін пра неўміручасць беларускай паэзіі, пра яе вышыні. І яшчэ — якраз той выпадак, калі вершаваная кніга чытаецца ад першай да апошняй старонкі.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# СУВЕРЭННАЙ ДЗЯРЖАВЫ

нашай краіны. У палітычным плане ЮНЕСКА выступае ў ролі трыбуны для прапаганды дасягненняў беларускай навукі, культуры, адукацыі. Гэта, безумоўна, садзейнічае ўмацаванню станоўчага іміджу Беларусі на міжнароднай арэне. У практычным плане такое супрацоўніцтва адкрывае перад установамі навукі, культуры і адукацыі нашай краіны магчымасці ўдзелу ў міжнародных інтэлектуальных абменах для прыцягнення міжнароднага вопыту, інфармацыйных матэрыялаў, экспертнай, тэхнічнай і іншай дапамогі.

Трэба адзначыць, што Беларусь абрана ў кіруючы орган арганізацыі — Выканаўчую раду ЮНЕСКА на перыяд 2017—2021 гадоў. Пераканаўчая перамога нашай краіны на гэтых выбарах з'яўляецца адлюстраваннем яе аўтарытэту на міжнароднай арэне. ЮНЕСКА высока ацэньвае заслугі Беларусі ў галіне захавання і развіцця нацыянальнага патэнцыялу ў адукацыі, навуцы і культуры. Удзел у рабоце Выканаўчай рады дае нам магчымасць уплываць на фарміраванне палітыкі арганізацыі і прасоўваць свае інтарэсы.

***— Беларусь працягвае руку многім краінам, якія апынуліся ў цяжкім становішчы з-за прыродных катастроф або ваенных дзеянняў. Якая роля МЗС у ажыццяўленні такой дапамогі? Ці існуюць пэўныя крытэрыі пры выбары краін, якім будзе прапанавана садзейнічанне?***

— ПРЫТРЫМЛІВАЮЧЫСЯ прынцыпу салідарнасці, мы заўсёды гатовы аказаць пасільную дапамогу замежным сябрам і партнёрам, якія апынуліся ў складанай сітуацыі. У гэтай справе МЗС традыцыйна супрацоўнічае з калегамі з іншых ведамстваў, перш за ўсё з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях.

Толькі ў апошнія гады па рашэнні Прэзідэнта Беларусі былі рэалізаваны гуманітарныя праекты ў шэрагу краін свету, сярод якіх В'етнам, Грузія, Малдова, Украіна, Эквадор.

Варта адзначыць, што мы імкнёмся аказаць дапамогу ўсім, хто да нас звяртаецца. Відавочна, што буйным прыродным ці тэхнагенным катастрофам можна супрацьстаяць толькі разам. Салідарная пазіцыя Беларусі заўсёды выклікае падзяку.

Напрыклад, мінулае лета, як вы памятаеце, было сухім і спякотным. Ад гэтага пакутавалі не толькі мы, але і краіны Балтыі і Скандынавіі. У Швецыі і Латвіі распачаліся буйныя лясныя пажары. Улічваючы, што на тушэнне пажараў сваімі сіламі Латвіі спатрэбіцца шмат часу, афіцыйная Рыга па дыпламатычных каналах звярнулася да нас па дапамогу. Безумоўна, мы аператыўна адрэагавалі, і верталёт беларускага МНС прымаў удзел у тушэнні пажараў. Што датычыцца Швецыі, то мы праз пасольства ў Стакгольме прапанавалі дапамагчы ў тушэнні пажараў і там, за што шведскі прэм'ер шчыра падзякаваў.

З гэтых прыкладаў бачна, што мы гатовы дапамагчы ўсім, каму патрэбна падтрымка ў складаны час.

Мы прыходзім на дапамогу не толькі з-за прыродных катастроф. Беларусь не можа заставацца абыякавай да цяжкай гуманітарнай абстаноўкі ў Сірыі з-за працяглага ўзброенага канфлікту.

У 2015—2018 гадах сірыйскаму боку былі перададзены тры партыі гуманітарнай дапамогі — прадукты харчавання, лекі, дзіцячая вопратка і абутак. Як вы ведаеце, менавіта ў гэты час ажыццяўляецца чарговая акцыя па адпраўцы гуманітарнага грузу з Беларусі ў Сірыю. Міністэрства замежных спраў, пасольства Беларусі ў Дамаску аказваюць МНС неабходнае садзейнічанне ў фарміраванні і дастаўцы гэтых гуманітарных грузаў.

Беларусь штогод ажыццяўляе гуманітарныя акцыі па арганізацыі адпачынку і аздараўлення дзяцей з краін, якія пацярпелі ад ваенных дзеянняў ці прыродных катастроф. У нас ужо праходзілі аздараўленне дзеці з Сірыі, Японіі, Кітая, і гэтую практыку плануецца працягнуць. МЗС і пасольствы актыўна ўзаемадзейнічаюць у гэтым кірунку з Міністэрствам адукацыі.

***— Нядаўна вы параўналі службу дыпламатаў з ваеннай, бо яны «вядуць баталіі на палітычнай, эканамічнай і гуманітарнай міжнародных пляцоўках». Якім чынам МЗС супрацоўнічае з ведамствамі, якія непасрэдна адказваюць за бяспеку нашай краіны?***

— ПАЛІТЫЧНЫЯ, ваенныя і іншыя аспекты нацыянальнай, рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі звязаны паміж сабой. У забеспячэнне бяспекі ўцягнутыя ўсе дзяржаўныя органы. Таму для МЗС цеснае ўзаемадзеянне з міністэрствамі і ведамствамі так званага сілавога блока, але і не толькі з імі — неад'емны элемент штодзённай дзейнасці. Па ўсіх пытаннях, якія закранаюць нацыянальную і міжнародную бяспеку, мы працуем у цеснай звязцы.

Вы ведаеце прымаўку, што пакуль не пачалі гаварыць гарматы, слова належыць дыпламатам, і я б дадаў, што, калі пачалі гаварыць, то дыпламаты абавязаны працаваць разам з Міністэрствам абароны. Так, сумесна з гэтым ведамствам мы вырашаем задачы па выкананні нацыянальных абавязацельстваў па міжнародных дагаворах і пагадненнях у галіне кантролю над узбраеннямі і раззбраення, напрыклад, па Дагаворы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе. (**«Звязда»**: У гэтай галіне Беларусь таксама выконвае абавязацельствы па Дагаворы па адкрытым небе, Венскім дакуменце 2011 года аб мерах умацавання даверу і бяспекі, Канвенцыі аб забароне супрацьпяхотных мін і шэрагу іншых). Добрым прыкладам нашага супрацоўніцтва стала поўнае знішчэнне ў Беларусі супрацьпяхотных мін у рамках адпаведнай Канвенцыі.

Мы аказваем садзейнічанне ў пашырэнні штату ваенных дыпламатаў Беларусі. У прыватнасці, па дыпламатычных каналах праводзім працэдуру ўзгаднення з замежнымі краінамі прызначэння адпаведных прадстаўнікоў пры нашых замежных установах.

МЗС па дыпламатычных каналах узгадняе палёты паветраных суднаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь праз тэрыторыю замежных дзяржаў і, наадварот, у рамках выканання рэйсаў ваеннага паветранага транспарту іншых краін праз беларускую тэрыторыю.

А вось яшчэ адзін цікавы, на мой погляд, прыклад супрацоўніцтва. Летась сумесна з калегамі з Міністэрства абароны было арганізавана наведванне прадстаўнікамі замежнага дыпламатычнага корпуса 120-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады Паўночна-Заходняга аператыўнага камандавання. Мерапрыемства дазволіла прадэманстраваць высокую арганізаванасць і абараназдольнасць нашых вайскоўцаў, а таксама гатоўнасць да ўзаемадзеяння па забеспячэнні стабільнасці ў рэгіёне. Замежныя дыпламаты асабліва падкрэслівалі адкрытасць беларускага боку ў ваеннай вобласці.

З Камітэтам дзяржаўнай бяспекі ўзаемадзейнічаем па пытаннях барацьбы з міжнародным тэрарызмам і выканання глабальных антытэрарыстычных канвенцый ААН.

Разам з Дзяржкамваенпрамам, КДБ, Дзяржаўным мытным камітэтам і шэрагам іншых ведамстваў прымаем неабходныя меры для недапушчэння распаўсюджвання матэрыялаў, тавараў і тэхналогій, якія могуць быць выкарыстаны для стварэння зброі масавага знішчэння.

Мы ўжо закраналі сёння тэму цеснага супрацоўніцтва з МНС у рамках акцый па дастаўцы гуманітарнай дапамогі з Беларусі замежным дзяржавам.

Па пытаннях міжнародна-прававога ўсталявання Дзяржаўнай мяжы МЗС шчыльна працуе з Дзяржаўным пагранічным камітэтам, Дзяржкаммаёмасці, Мінтрансам, Мінпрыроды, мясцовымі органамі ўлады. У гэтай справе пагранічнікі, дыпламаты, геадэзісты, картографы, іншыя спецыялісты — адзіная каманда.

Ведаеце, паслядоўная і адказная знешняя палітыка Беларусі, пра якую сёння добра вядома на міжнароднай арэне, — гэта вынік у тым ліку эфектыўнага міжведамаснага ўзаемадзеяння і сумеснай працы. Таму, карыстаючыся магчымасцю, хацеў бы падзякаваць калегам з іншых ведамстваў за плённае супрацоўніцтва з МЗС.

***— Хто з былых ці сённяшніх дзеячаў на знешнепалітычнай сусветнай арэне з'яўляецца аўтарытэтам менавіта для вас?***

— НА шчасце, у маім асяроддзі нямала людзей, да якіх я адчуваю пачуццё глыбокай павагі і прызнання. Іх вылучаюць асаблівыя якасці — асабістыя і прафесійныя, якія мне імпануюць, якія імкнуся пераймаць і па меры магчымасці «рэтрансляваць».

Адукаванасць, сумленнасць, адказнасць і адданасць сваёй справе, чуласць і ўвага да людзей — вось толькі некаторыя з іх.

Хацеў бы адзначыць выдатных беларускіх дыпламатаў, якія ўнеслі неацэнны ўклад у станаўленне нацыянальнай дыпламатычнай службы і беларускай дзяржаўнасці. Асабіста для мяне яны з'яўляюцца прыкладамі мудрасці і дальнабачнасці, сапраўднага патрыятызму і адданасці Айчыне. У іх ліку перш за ўсё назаву Кузьму Венедзіктавіча Кісялёва, Анатоля Емяльянавіча Гурыновіча.

Гэты спіс можна працягваць. Галоўнае, што, на мой погляд, аб'ядноўвае гэтых людзей, — кожны з іх у свой час і на сваёй пасадзе спрыяў стварэнню трывалага знешнепалітычнага падмурка нашай краіны, умацаванню яе суверэнітэту, адстойваў нацыянальныя прыярытэты і садзейнічаў уваходжанню беларускай дзяржавы ў сусветную супольнасць у якасці паўнапраўнага члена. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы ім Беларусь здолела заняць «свой пачэсны пасад між народамі», які сённяшні МЗС імкнецца актыўна захоўваць і ўмацоўваць.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях у сучасным выглядзе створана 19 студзеня 1999 года. За гэты час здзейснена больш за 60 гуманітарных місій у 25 краін свету.

— Практычна ў кожнай з гэтых місій мы ўзаемадзейнічалі з Міністэрствам замежных спраў, — расказвае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.**

Міністэрства замежных спраў дапамагае прайсці ўсе міждзяржаўныя працэдуры і кантактуе з пацярпелым бокам. Да паступлення запыту ад краіны вядуцца перагаворы наконт таго, у чым яна мае патрэбу. Потым гэты запыт прыходзіць па дыпламатычных каналах і супастаўляецца з нашымі магчымасцямі. Беларусь непасрэдна вырашае, што гэта будзе за груз, і з дапамогай МЗС інфармуе аб тым краіну, у якую ён будзе дастаўляцца.

Само аказанне дапамогі практычна заўсёды праходзіць пры падтрымцы беларускіх дыпламатаў — як з цэнтральнага апарату МЗС (дзе вырашаюцца арганізацыйныя пытанні), так і пасольстваў, консульстваў, калі яны ёсць, на тэрыторыі краіны, куды дастаўляецца гуманітарная дапамога.

У апошнія гады беларускія паслы самі прымаюць удзел у працэдуры перадачы дапамогі. Так было і ў Сірыі, і ў Эквадоры, і ва Украіне, і ў В'етнаме. У гэтыя дзяржавы адпраўлены апошнія канвоі дапамогі.

Эквадор — самы далёкі пункт, дзе мы аказвалі дапамогу. Там з-за землятрусу былі маштабныя разбурэнні. Без дапамогі МЗС не абысціся і таму, што ёсць асаблівасці ў дастаўцы грузаў у пэўную краіну. Па словах прадстаўніка МНС, узніклі пытанні з афармленнем грузаў пры іх перавозцы ва Украіне, калі ён ішоў у Данецкую і Луганскую вобласці. Былі патрабаванні ў Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, якому гэта дапамога перадавалася на тэрыторыі Украіны. У вырашэнні гэтага пытання садзейнічаў пасол Беларусі.

— Асаблівасць адносін сірыйскай улады да гуманітарнай дапамогі ў тым, што яе ніколі не адпраўляюць на склад. Яна адразу выдаецца тым, хто мае патрэбу, — каму і куды вырашаецца ва ўзаемадзеянні з пасольствам. Я два разы прымаў удзел у гэтых місіях. Мы на самалёце прылятаем, груз размяркоўваецца па машынах, і яны адразу едуць у мячэць, бальніцу. І мы самі перадавалі дапамогу людзям. За тым, каб гэта было хутка і лёгка, і стаіць вялікая праца дыпламатаў, — расказаў Віталь Навіцкі.

Звычайна дастаўка грузаў у Сірыю займае 28—30 дзён. І магчыма, у гэты час у адзін з сірыйскіх партоў прыбыў (або прыбудзе ў найбліжэйшыя дні) чацвёрты гуманітарны груз, які быў сфарміраваны і адпраўлены з Беларусі ў канцы снежня. І, як заўсёды, пры яго разгрузцы і перадачы супрацоўнікі МНС разлічваюць на дапамогу беларускага пасольства.



Адпраўка гуманітарнай дапамогі ў Сірыю.

Фота БелТА

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Узважаную шматвектарную палітыку міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках сваёй кампетэнцыі выбудоўвае Дзяржпагранкамітэт. Планамерная і паступальная работа ў гэтым кірунку праводзіцца ў цесным узаемадзеянні і пры падтрымцы МЗС, якое ў цэлым адказвае за знешнепалітычнае забеспячэнне пагранічнай бяспекі.

— Адным з кірункаў сумеснай з МЗС дзейнасці з'яўляецца дэлімітацыя і дэмаркацыя граніцы, дзе ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь Дзяржпагранкамітэт удзельнічае ва ўстанаўленні Дзяржаўнай граніцы, а таксама выконвае задачы па праверцы праходжання і арганізацыі яе ўтрымання, — расказвае **Раман ПОДЛІНЕЎ, начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Дзяржаўнага пагранічнага камітэта.**

З 1992 да 1997 года пагранічнае ведамства разам з МЗС актыўна ўдзельнічала ў рабоце сумесных з іншымі дзяржавамі камісій па дэлімітацыі граніцы з Літоўскай Рэспублікай, Латвійскай Рэспублікай і Украінай.

Работа ў гэтым кірунку працягваецца і сёння. Так, у 2008 годзе завершана дэмаркацыя мяжы з Літвой, у 2009 годзе — з Латвіяй. Вядуцца работы па дэмаркацыі беларуска-украінскага ўчастка граніцы, якія плануецца завяршыць да 2026 года.

Дзяржпагранкамітэт ва ўзаемадзеянні з МЗС удзельнічае ў распрацоўцы праектаў, звязаных з рэжымам Дзяржаўнай граніцы і супрацоўніцтвам па пагранічных пытаннях.

— З Расійскай Федэрацыяй нарматыўная прававая база налічвае больш за 20 дакументаў. Яны прадугледжваюць, што ва ўмовах адкрытасці мяжы паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй нашы дзяржавы будуць ажыццяўляць належныя меры на сваіх межах з трэцімі краінамі для бяспекі адзін аднаго і супрацоўнічаць у вырашэнні пагранічных пытанняў, — адзначае Раман Подлінеў.

Яшчэ адным важным кірункам сумеснай дзейнасці Дзяржпагранкамітэта і МЗС з'яўляецца прыцягненне міжнароднай тэхнічнай дапамогі для павышэння пагранічнай бяспекі. Асноўнымі донарамі выступаюць Еўрапейскі саюз, Міжнародная арганізацыя па міграцыі, ПРААН, УВКБ ААН, АБСЕ, а таксама Дзярждэпартамент і Міністэрства энергетыкі ЗША.

— У гэтым пытанні мы ўзаемадзейнічаем больш за 15 гадоў. За гэты час агульны аб'ём прыцягнутай дапамогі ў інтарэсах пагранічнага ведамства складае больш за 50 мільёнаў еўра. Пры гэтым, значны ўклад у прадстаўленне інтарэсаў пагранічнікаў уносяць замежныя ўстановы Рэспублікі Беларусь, — прыводзіць лічбу Раман Подлінеў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Сапраўдным беларускім «Артэкам» празвалі дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня», які размясціўся на маляўнічым беразе Нарачы. За два апошнія гады яго наведалі 3500 хлопцаў і дзяўчат з 16 краін свету. Пазнаёміцца з «Зубранём» яны змаглі пры непасрэднай дапамозе беларускіх пасольстваў і дыпламатаў.

На працягу сямі гадоў цэнтр запрашае папраравіць здароўе дзяцей з Японіі, якія пацярпелі ад аварыі на станцыі «Фукусіма». Кожны год у нашу краіну прыязджае каля 120 хлопцаў і дзяўчат. Ініцыятарам праекта выступіў былы пасол Беларусі ў Японіі Сяргей Рахманаў. Сёння гэту справу працягвае кіраўнік пасольства Руслан Есін.

Усе арганізацыйныя пытанні па адпачынку, у першую чаргу, вырашае дыпламатычнае прадстаўніцтва. Асабіста займаўся падрыхтоўкай аздараўлення дзяцей з палаючага рэгіёна былы пасол у Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы Аляксандр Панамароў. Летась да нас прыехалі 500 сірыйскіх дзяцей. Арганізаваць візіт, які, на думку многіх юнакоў і дзяўчат, стаў найлепшай падзеяй, што адбылася за апошні час у іх жыцці, было складана. «У краіне, дзе ідуць ваенныя дзеянні, цяжка сабраць дзяцей, забяспечыць пералёт. Яны ляцелі праз Бейрут, — расказвае **Надзея АНУФРЫЕВА, дырэктар цэнтра «Зубраня»**. — У студзені 2018 года праводзілася змена «Інтэлект.Творчасць. Спорт», калі сірыйскія і беларускія дзеці ўдзельнічалі ў алімпіядах па разнастайных навуках, і ў музычных, балетных, вакальных, спартыўных спаборніцтвах. Атрымалася не толькі аздараўленчая праграма, але і адукацыйная».

Таксама супрацоўнічае з беларускім «Артэкам» пасольства нашай краіны ў Туркменістане і яго кіраўнік Алег Табанюхаў. Тры гады ў лагер прыязджаюць дзеці са школы імя А. С. Пушкіна, што ў Ашгабаце. Тут карысць яны атрымліваюць у квадраце — удасканальваюць і рускую мову, і здароўе. Пастаянна пры непасрэдным удзеле пасольства выдзяляецца квота на наведванне цэнтра дзецям з беларускамоўнай гімназіі ў Вільнюсе. Працуе лагер і над супрацоўніцтвам з Кітаем. Налета, па планах, наведаюць Мядзельшчыну больш за 100 дзяцей з Паднябеснай.

Такое міжкультурнае ўзаемадзеянне, арганізаванае пры дапамозе дыпламатаў, не толькі дае магчымасць замежным гасцям папраравіць здароўе і пазнаёміцца з Беларуссю, але і ўзбагачае айчынную моладзь. Падчас сумесных змен падрастаючае пакаленне беларусаў развівае крос-культурныя камунікацыйныя веды і практыкуе замежныя мовы.



## Вяршыні Андрэя Грамыкі

**«Звязда» задала некалькі пытанняў пра нашага земляка, патрыярха дыпламатыі і міністра замежных спраў СССР з 1957 да 1985 года Андрэя Андрэевіча Грамыку, ураджэнца вёскі Старыя Грамыкі (цяпер у Веткаўскім раёне Гомельскай вобласці) яго ўнуку — Аляксею Анатольевічу ГРАМЫКУ, дырэктару Інстытута Еўропы Расійскай акадэміі навук, доктару палітычных навук.**



***— Аляксей Анатольевіч, што з дасягненняў Грамыкі-дыпламата асабліва актуальна сёння?***

— Думаю, гэта, па крайняй меры, тры рэчы.

Па-першае, стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у ліпені 1945 года на міжнароднай канферэнцыі ў Сан-Францыска. З тых часоў мінула 73 гады, але ААН не толькі захавалася, яна застаецца на парадак вышэйшай па сваім аўтарытэце і ўніверсальнасці, чым любая іншая міжнародная арганізацыя.

Па-другое, падпісанне шэрагу асноватворных міжнародных пагадненняў па кантролі над узбраеннямі і нераспаўсюджванні. Найбольш важныя з іх працягваюць дзейнічаць і ўтрымліваць свет, па меншай меры пакуль, ад безагляднай гонкі ўзбраенняў, у тым ліку ў ядзернай сферы. Гэта і дагавор 1963 года аб забароне выпрабавання атамнай зброі ў трох сферах, і дагавор 1968 года аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Вядома, дамовы з ЗША аб абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў (СНУ); іх спадчыннік — СНУ-3, падпісаны Расіяй і ЗША ў 2010 годзе. Вельмі важным быў дагавор аб абмежаванні сістэм супрацьракетнай абароны 1972 года. Выхад з яго ЗША ў 2002 годзе заклаў міну запаволенага дзеяння пад сусветную архітэктуру бяспекі.

І, па-трэцяе, бясспрэчна, выдатным дасягненнем савецкай дыпламатыі быў Хельсінкскі заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе ў 1975 годзе, які змяшчае так званы дэкалог. Нездарма цяпер на самым высокім узроўні працягвае абмяркоўвацца ідэя «Хельсінкі-2». У яе прасоўванні вялікую ролю адыгрывае Беларусь.

***— Якія, на ваш погляд, рысы характару дапамаглі Андрэю Андрэевічу Грамыку дамагчыся галоўных перамог на дыпламатычнай ніве?***

— У першую чаргу — гэта неймаверная цяга да ведаў, да аналітыкі, да пранікнення ў сутнасць рэчаў. Гэта настойлівасць, паслядоўнасць, творчы падыход да дасягнення мэт, павага да іншага пункту гледжання. Вядома, гэта і прыроджаны ўзровень інтэлекту і бліскучая памяць. Але, упэўнены, што нават такія якасці не дапамаглі б дзеду раскрыць свой патэнцыял у поўнай меры, калі б не шалёная працавітасць, працэс саманавучання даўжынёю ў жыццё і, вядома, адданасць Радзіме, у тым ліку радзіме малой — Гомельшчыне.

***— У 2019 годзе вялікаму дыпламату савецкай эпохі, як заслужана называюць Андрэя Грамыку, споўнілася б 110 гадоў. Раскажыце, як яго памяць будзе ўшаноўвацца абедзвюма краінамі — Беларуссю і Расіяй?***

— 18 ліпеня 2019 года Андрэю Андрэевічу споўнілася б 110 гадоў. У новым годзе ў гонар гэтай падзеі пройдзе шэраг навуковых канферэнцый, з'явяцца прысвечаныя яму і гісторыі дыпламатыі новыя дакументальныя фільмы; будзе створана Асацыяцыя міжнародных даследаванняў імя А. А. Грамыкі з удзелам вядомых расійскіх і беларускіх навукоўцаў, дыпламатаў, палітыкаў.

## Цікавінкі дыпламатыі

### ХТО ТАКІ ДУАЕН?

У дыпламатычным лексіконе існуе паняцце дуаен — гэта неафіцыйны пратакольны кіраўнік дыпкорпуса, старэйшы па класе і часе знаходжання ў краіне пасол аднаго з прадстаўніцтваў. У адпаведнасці з прынятай практыкай менавіта дуаен можа рабіць заявы на разнастайных мерапрыемствах ад імя ўсяго дыпкорпуса. Дуаенам у Беларусі доўгі час быў пасол Расіі Аляксандр Сурыкаў. Ён працаваў у нашай краіне 12 гадоў. Сёння дуаенам з'яўляецца Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Палесціны Халед Арыкат, які ўзначальвае дыппрадстаўніцтва сваёй краіны з 2011 года.

### ФЕЛЬД'ЕГЕРЫ НА СЛУЖБЕ

Гісторыя дыпламатычных службаў па сутнасці пачыналася з «ганцоў», якія дастаўлялі граматы ў замежныя дзяржавы. Са з'яўленнем электроннай сувязі падобная місія не страціла значнасці — у дыпламатыі па-ранейшаму ў асаблівых выпадках прызнаюцца толькі арыгіналы. У МЗС існуе дыпламатычная пошта — асаблівы від сувязі з дыпламатычнымі ўстановамі за мяжой. Сёння «асаблівую» карэспандэнцыю за мяжу рэгулярна дастаўляюць спецыяльныя кур'еры фельд'егерскай службы.

### ПЕРШЫ ДОМ МЗС

У 1919 годзе Камісарыят па замежных справах Беларусі пачаў сваю дзейнасць у доме № 21 па вуліцы Койданаўскай у Мінску. У той час яна была адна з цэнтральных у сталіцы: на ёй размяшчаліся шматлікія ўстановы, прыватныя клінікі. У 1922 годзе з нагоды пяцігадовага юбілею Кастрычніцкай рэвалюцыі вуліца атрымала сучасную назву — Рэвалюцыйная. Вядома, што будынак па Койданаўскай, 21 захаваўся на Рэвалюцыйнай, толькі змяніў нумар на 15. Сёння там размяшчаецца Пасольства Швецыі. Дарэчы, першым камісарам па замежных справах быў Усевалад Фальскі, які сумяшчаў працу дыпламата з прафесіяй артыста.

### МЕДЫК-ДЫПЛАМАТ

Значны ўклад у станаўленне дыпламатычнай службы Беларусі ўнёс Кузьма Кісялёў, які займаў пасаду і намесніка старшыні Савета Народных Камісараў БССР, і міністра замежных спраў БССР. Ён кіраваў дэлегацыяй нашай краіны падчас стварэння ААН у 1945 годзе, куды Беларусь увайшла ў рангу краіны-заснавальніцы. Такім чынам, пад Статутам ААН былі подпісы двух беларусаў — Андрэя Грамыкі (як прадстаўніка СССР) і Кузьмы Кісялёва. Па адукацыі ён быў урачом-неўрапатолагам, таму менавіта Кузьма Кісялёў прапанаваў беларускаму кіраўніцтву стварыць анкалагічную бальніцу. Спецыялізаваныя цэнтры па барацьбе з анкалогіяй былі ў той час толькі ў Маскве, Ленінградзе і Кіеве. Ідэю падтрымалі і хадайнічалі аб гэтым перад Масквой, якая выдзеліла сродкі. Будаўніцтва пачалося, але з цягам часу грошы скончыліся. Таму аднойчы, выступаючы на трыбуне ААН, Кісялёў самавольна дабавіў у тэкст звесткі, што ў Беларусі ўжо будуюць анкалагічную бальніцу, і запрасіў гасцей паглядзець, як ідзе працэс. Інфармацыю разнеслі газетчыкі па ўсім свеце. І тады сродкі з Масквы выдзелілі другі раз. Кісялёву такую недысцыплінаванасць не даравалі. Праз пэўны час яго знялі з паста намесніка старшыні Савета Міністраў і пакінулі толькі міністрам замежных спраў БССР. Па ўспамінах яго дзяцей, пасля гэтай падзеі ён сказаў: «Дзеці, пасты прыходзяць і сыходзяць, а бальніцы застаюцца».

Жыць — здорава!

# У 89 — НА ШПАГАТ



**Штодзённая прабежка раніцай і комплексныя фізічныя практыкаванні, халодны душ і бег па снезе басанож — гэта распарадак дня не адчайнага экстрэмала, а звычайнай жанчыны з горада Быхава. І ўсё б нічога, прыгожая палова чалавецтва сёння і не на такое здатная, але нашай гераіні амаль дзевяноста гадоў.**

— Навошта пра мяне пісаць, падумаеш, зорку знайшлі, — сціпла кажа Феадосія Нічыпараўна Дудзенка, сустрэўшы нас каля пад'езда.

Але ўсё ж запрашае ў госці. Хутка, нібы і няма амаль векавога цяжару гадоў за плячыма, наша знаёмая падымаецца па лесвічных пралётах. Толькі паспяваем следам. Убачыўшы наша здзіўленне, Феадосія Нічыпараўна толькі ўсміхаецца.

— Што, не чакалі такога спрыту ад бабулі? Я і не тое магу, вось толькі ў кватэру зойдзем — самі пабачыце.

У аднапакаёвай кватэры, дзе жыве Феадосія Нічыпараўна, — ідэальны парадак, прыемна глянуць.

На самым бачным месцы красуюцца фотаздымкі родных, тут жа на трыльяжы можна пабачыць і граматы за добрасумленную працу, за ўдзел у творчых выступленнях.

Не чакаючы, пакуль дапытлівы карэспандэнт усё разгледзіць, Феадосія Нічыпараўна выконвае абяцанне і працягвае здзіўляць: ужо праз хвіліну мая суразмоўніца глядзела знізу ўверх на мой спалоханы твар, элегантна седзячы на шпагаце.

Нельга сказаць, што я не ведаў, куды ішоў, вядома, чакаў пабачыць «спартыўную бабулю». Але каб вось так у 89 гадоў — ды на шпагат! Пакуль я збянтэжана назіраў за акрабатычным трукам «гімнасткі», яна гэтак жа проста і без дапамогі ўзнялася на ногі.

**«Раніцу пачынаю з зарадкі... Пасля выпіваю шклянку вады і з'ядаю ківі. Ну а затым ужо і час халодны душ прымаць. Раніцай бегаю. Зараз, калі выпаў снег, абавязкова — басанож. Ну а ўвечары павольна шпацырую па вуліцы».**

— Сесці на шпагат — гэта справа не аднаго дня, — кажа Феадосія Нічыпараўна. — Трэба кожны дзень расцяжку рабіць і іншыя практыкаванні на гнуткасць цела, толькі тады толк будзе.

З добрай зайздрасцю назіраючы за суразмоўніцай, не мог не запытаць, як у такім паважаным узросце ёй удаецца весці актыўны лад жыцця. І ці ёсць у Феадосіі Нічыпараўны свой сакрэт даўгалецця? Бабуля запэўніла ў адказ, што не мае ніякіх сакрэтаў, акрамя спартыўных практыкаванняў і загартоўвання. А пра гэтыя «сакрэты» яна можа кожнаму расказаць.

— Раніцу пачынаю з зарадкі, — дзеліцца Феадосія Нічыпараўна. Яшчэ лежачы ў ложку, сорак разоў прыпадымаю ногі, затым раблю «нажніцы» і «кручу ровар». Потым устаю і раблю практыкаванні на гнуткасць. Пасля зарадкі выпіваю шклянку вады і з'ядаю ківі. Ну а затым ужо і час халодны душ прымаць. Раніцай бегаю. Зараз, калі выпаў снег, абавязкова — басанож. Ну а ўвечары павольна шпацырую па вуліцы.





Як яна кажа, такія халадовыя ванны дапамагаюць ёй не хварэць круглы год і падтрымліваць бадзёрасць увесь дзень.

У ядзе Феадосія Нічыпараўна прытрымліваецца поўнай свабоды.

— Усё без разбору, што Бог паслаў. Гэтая звычка яшчэ з дзетдома засталася. Калі бацькі памерлі, нас, чатырох дзяцей, адправілі ў дзетдом, там мы і сустрэлі вайну. Чаго толькі не нацярпеліся! Бывала, што і на сметніцах прыходзілася ежу шукаць, — дзеліцца горкімі ўспамінамі суразмоўніца.

...Не ўсім зразумела такое захапленне здаровым ладам жыцця з боку жанчыны. Бо сваім прыкладам Феадосія Нічыпараўна руйнуе ўсе стэрэатыпы аб беларускіх бабулях.

— Першы час здзіўляліся, калі бачылі сляды босых ног на снезе. Пыталіся: як гэта ты так, Феня? Каб было менш пытанняў, стараюся бегаць у час, калі мала хто мяне бачыць.

Занятак фізкультурай — не адзінае хобі Феадосіі Нічыпараўны Дудзенка. Яшчэ раней, у гады маладосці, яна захапілася спевамі, і гэты творчы запал пранесла праз усё жыццё.

— Працуючы стрэлачніцай на чыгунцы, я заўжды знаходзіла час, каб схадзіць на гурток самадзейнасці ў Дом культуры. Любоў да спеваў жыве ўва мне і сёння. Разам з сябрамі я выступаю ў народным ансамблі «Гаспадыня», мы ўдзельнічаем у святочных імпрэзах нашага горада і раёна. Таксама, як валанцёр Чырвонага Крыжа, наведваю розныя мерапрыемствы, якія праводзіць гэтая арганізацыя.

Вось такое яскравае жыццё ў нашай гераіні. Няма ёй часу скардзіцца на лёс і цяжкую долю: страціўшы блізкіх, прайшоўшы праз жахі вайны, яна застаецца добрым і спагадлівым чалавекам.

**Андрэй САЗОНАЎ. Фота аўтара.**

Спытайце пра радзіннае

# Ці варта святкаваць 40-годдзе?

**У лісце з Бабруйска ад Валянціны К. пытанне: «Хутка мне споўніцца 40 гадоў. Я чула шмат розных меркаванняў наконт гэтай даты. Адкажыце, дык святкаваць або не?»**

Святкаванне нашых дзён нараджэнняў — пытанне складанае, далёка не адназначнае, шмат у чым супярэчлівае. Пакуль што яно застаецца зусім не даследаваным з боку славянскіх навукоўцаў. Складанасць пытання заключаецца ў тым, што дзень нараджэння чалавека знітоўвае ў сабе шэраг касмічных і сацыякультурных фактараў. Супярэчлівае — таму што даўняя традыцыя забараняе святкаваць некаторыя дні нараджэнняў і, наадварот, асобныя з іх надзяляе больш высокім статусам, напрыклад, так званыя круглыя даты.

Шматвяковая гісторыя культуры народа сфарміравала свой прынцып парадкавання часу, які атрымаў назву каляндар. Сістэмы парадкавання часу, або календары, бываюць розныя: месяцавыя — у адпаведнасці з рытмам змен фаз Месяца; сонечныя — у іх аснову пакладзена чаргаванне сонцастаянняў і раўнадзенстваў; у аснове хрысціянскага календара адначасова ляжыць рух Сонца па небасхіле і чарговасць фаз Месяца. Каляндар — рэч цыклічная, структурна дакладна ўпарадкаваная, як правіла, нязменная. Усе прадстаўнікі таго ці іншага этнасу або тыпу культуры адзначаюць кожнае свята як вялікую падзею.

Аднак у межах агульнанацыянальнага календара існуе яшчэ адзін цыкл святкаванняў, аснову якога складае часавая прымеркаванасць сямейна-родавых рытуалаў, якія суправаджаюць нараджэнне дзіцяці, вяселле сына ці дачкі, смерць каго-небудзь з дамачадцаў. Кожная з гэтых падзей мела сваю аўру, характар падрыхтоўкі і правядзення, свой перыяд існавання ў памяці чалавека, сям'і, рода або яшчэ больш шырокага соцыуму. Напрыклад, на працягу года пасля смерці мужа яго жонка-ўдава не мела права мыць бялізну ў той дзень тыдня, у які ён памёр, каб «не замыць сваю долю». У гэтым выпадку абрадавая забарона датычылася толькі аднаго чалавека. Разам з тым у той хаце, у якой не стала чалавека, забаранялася на працягу года рабіць рамонт (у поле рэгламентацый уцягнута ўжо ўся сям'я) і спраўляць вяселле (рытуальнае абмежаванне ахоплівала кола людзей, якое яднала нават некалькі родаў).

І ўсё ж бадай што самай складанай была градацыя святкавання дзён нараджэння чалавека. Так, сярод дзён нараджэння ў народнай традыцыі асобным статусам надзяляліся тры або сем гадоў, калі дзіцяці давалі развязаць сваю пупавіну і па тым, як яно гэта зробіць, меркавалі аб здольнасцях чалавека. Лічылася, калі дзіця здолее развязаць засохлы вузельчык, то яно будзе майстрам на ўсе рукі, і ў народзе казалі: «Што ні задумае, тое і зробіць», або «У яго руках усё гарыць», пазней сталі гаварыць «Майстар — залатыя рукі». У гэтым жа ўзросце пачыналася размежаванне дзяцей у адзенні ў адпаведнасці з полавай прыналежнасцю.

Разам з тым старэйшыя прадстаўнікі роду не раілі святкаваць трынаццацігоддзе (відаць, на падставе адмоўнага стаўлення да ліку 13 у самых розных кантэкстах судакранання з ім; магчыма, у гэтым выпадку мы маем справу з моцным уплывам хрысціянскай традыцыі), а таксама яшчэ тры незвычайныя даты. Не святкавалі 21-ы дзень нараджэння (як пярэварацень касмічнага ліку 12). Не адзначалі і 33 гады — той узрост, у якім быў укрыжаваны Ісус Хрыстос. Людзі перасцерагаліся («Беражонага і Бог беражэ») і хацелі адвесці бяду ад членаў сваёй сям'і. Асабліва асцярожна ставіліся да святкавання 40-годдзя. Гэты ўзрост лічыўся пераломнай мяжой у жыцці чалавека. Нагадаем, што ў беларускай народнай традыцыі чалавечы век доўжыўся не 100 гадоў, як мы прызвычаіліся, а крыху менш — 80. У такім разе саракавы год нараджэння быў той пераходнай мяжой у зямным існаванні чалавека, калі «жыццё пераварочвалася» (ад маладосці да старасці). Гэтае сімвалічна-пераходнае пераварочванне выразна адлюстравана ў пахавальна-памінальнай абраднасці 0-3-9-40-1 год. Калі да саракавога дня памерлага называлі «нябожчык», гэта значыць яго душа яшчэ не паўстала перад Богам, то якраз на саракавы дзень адбудзецца вельмі важная падзея ў пасляcмяротным жыцці чалавека, дакладней яго душы, якая пры спадарожніцтве анёлаў апынецца перад залатым прастолам і Творцам на судны час.

А вось пачынаючы з 50-годдзя кожны юбілей чалавечага жыцця станавіўся ганаровай падзеяй для ўсяго Роду. Юбілеі адзначалі шырока, як вялікае родавае свята, з удзелам шматлікіх гасцей.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

*Дасылайце свае пытанні аб каранях і прыстасаванасці да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».*

Крынічка
Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# СКЛАДАЕМ ПЛАН ПАСЕВАЎ

**Многія агародныя культуры вельмі патрабавальныя ў доглядзе і пасадцы, часта схільныя да хвароб або нападаў шкоднікаў, асабліва непрыемна, калі ўсе прыкладзеныя намаганні марныя з-за такой дробязі, як няправільна выбранае месца пасадкі. Каб пазбегнуць такой непрыемнасці, варта захоўваць севазварот. Кожны дасведчаны агароднік ведае, што пераважную большасць агародных культур можна высаджваць на ранейшае месца толькі праз некалькіх гадоў, паколькі вялікая верагоднасць развіцця хвароб расліны. Асобныя з іх не выносяць сваіх папярэднікаў, а іншыя, наадварот, лепш развіваюцца і пладаносяць, калі папярэдні «жыхар» пакінуў пасля сябе ўзбагачаную глебу. Пакуль не пачаліся гарачыя веснавыя дзянькі, можна заняцца планаваннем будучага агарода.**

**Баклажан.** Пасля гэтай агародніны нельга саджаць расліны з сямейства паслёнавых: бульбу, памідоры, перац. Каларадскі жук, які зімуе ў глебе, сілкуецца лісцем усіх раслін гэтага сямейства.

Баклажан — добры папярэднік для морквы, буракоў, гарбуза і цыбулі.

**Гарох** — расліна, якая ўзбагачае глебу азотам і з'яўляецца добрым папярэднікам практычна для ўсіх відаў культур. Аднак непажадана высаджваць на яго месца фасолю. Сам гарох вяртаюць на папярэдняе месца не раней, чым праз 5 гадоў.



Каб палепшыць ураджайнасць агародных культур, важна выконваць севазварот і саджаць расліны па прынцыпе севазвароту. Напрыклад, услед за раслінай з невялікай каранёвай сістэмай высаджваюць культуры з больш развітымі каранямі, якія пранікаюць глыбока ў глебу.

Акрамя таго, на месцы позна прыбраных культур непажадана сеяць расліны, якія патрабуюць ранняй пасадкі. Калі ж агародная культура была схільная да хваробы, услед за ёй саджаюць расліны, устойлівыя да гэтага захворвання.

Аднак некаторыя віды агародніны можна высаджваць на ранейшае месца год за годам пры ўмове ўзбагачэння глебы арганічнымі або мінеральнымі ўгнаеннямі, каб пазбегнуць яе знясілення. Да такіх культур адносяцца бульба, памідоры, суніцы і фасоля.

**Капуста** выцягвае з глебы шмат пажыўных рэчываў, акрамя таго, капусныя шкоднікі пакідаюць свае лічынкі на каранях расліны глыбока ў зямлі і з прыходам вясны паразітуюць на каранёвай сістэме такіх раслін як рэдзька, радыска і дайкон.

Капуста — добры папярэднік для агуркоў, бульбы і шпінату.

**Цыбуля.** Пасля рэпчатай цыбулі і парэю непажадана саджаць моркву і капусту.

На былой цыбульнай градцы добра высаджваць памідоры, агуркі, бабы, бульбу, рэпу і радыску.

**Морква** — дрэнны папярэднік для памідораў, пятрушкі і сельдэрэя.

Выдатна растуць на месцы гэтага караняплода цыбуля, часнок, агуркі, бульба, капуста, бракалі, кабачкі і буракі.

**Агуркі.** Як і з іншай агароднінай, што адносіцца да аднаго сямейства, пасля агуркоў не высаджваюць расліны з групы гарбузовых: кабачкі, патысоны, кавуны і дыні.

Агуркі — добрыя папярэднікі для бабоў, памідораў, кукурузы, бульбы, радыскі.

**Радыска.** На месцы радыскі будуць дрэнна расці і пладаносіць капуста і рэдзька, паколькі і яны адносяцца да сямейства крыжакветных, а таксама цыбуля і шпінат.

Услед за пасеянай ранняй вясной агароднінай можна высаджваць бульбу, памідоры, салату і кабачкі. Добра спалучаецца радыска ў сумесных пасадках з агуркамі, бульбай, суніцамі і вінаградам.

**Буракі.** Папярэдняе месца вырошчвання буракоў не падыходзіць такім агародным культурам, як морква, пятрушка, гарбуз і капуста.

На наступны год пасля буракоў можна высаджваць памідоры і кукурузу.

**Гарбуз** — дрэнны папярэднік для капусты і буракоў. Каб пазбегнуць хвароб раслін не пажадана на яго месцы саджаць культуры з роду гарбузовых.

На градках, дзе раслі гарбузы, вырошчваюць моркву, памідоры, кукурузу, бульбу і агуркі.

Даты | Падзеі | Людзі

**16 СТУДЗЕНЯ**

У краіне

**1599** год — нарадзіўся Казімір Семяновіч, мысліцель-гуманіст, інжынер і тэарэтык артылерыі. Выхадзец з сям'і князёў Семяновічаў, якія валодалі землямі на Віцебшчыне. Аўтар трактата «Вялікае мастацтва артылерыі, частка першая», у якім апісаў канструкцыі і выкарыстанне гармат і ракет, тэхналогію вытворчасці пораху і іншых матэрыялаў для артылерыі, а таксама ўпершыню прапанаваў ідэю шматступеньчатай ракеты, ракетных батарэй і стабілізатараў да ракет (з дадаткам чарцяжоў). Яго навуковыя працы і эксперыменты на многія гады наперад прадвызначылі шляхі развіцця еўрапейскай артылерыі. Прытрымліваўся гуманістычнага светапогляду, войны лічыў найвялікшым бедствам чалавецтва. Памёр пасля 1651 года.

**1905** год — нарадзіўся (вёска Прусінава, цяпер у Уздзенскім раёне) Алесь Пальчэўскі, беларускі пісьменнік. Першыя яго вершы і апавяданні былі надрукаваныя ў 1925 годзе. Аўтар п'ес «З чырвоным сцягам», «Суседка», зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Жнівеньская раніца», «Дым над лесам» і інш. Быў двойчы рэпрэсаваны, высланы ў Краснаярскі край. Пасля рэабілітацыі (1954) жыў у Мінску. Працаваў у газеце «Зорька», рэдактарам у Дзяржвыдавецтве БССР, адказным сакратаром часопіса «Вясёлка». Памёр у 1979 годзе.

**1919** год — 100 гадоў таму нарадзіўся (г. Бабруйск) Уладзімір Уладзіміравіч Алоўнікаў, вядомы беларускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, народны артыст Беларусі, прафесар. У 1962—1982 гадах рэктар Беларускай акадэміі музыкі. Аўтар сімфанічных твораў «Партызанская быль», «Песні міру», «Партызанскія песні», «Нарач», камерна-інструментальнай і вакальнай музыкі, хораў, рамансаў, шырока вядомых песень «Радзіма мая дарагая», «Лясная песня» і многіх іншых. Пісаў музыку для дзяцей, да спектакляў і кінафільмаў. Памёр у 1996 годзе.



**1919** год — ЦК РКП(б) пастанавіў абвясціць Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (ЛітБел) у складзе Мінскай, Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губерняў, а Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні перадаць у склад РСФСР. У аснову гэтага рашэння была пакладзена ідэя стварэння ва ўмовах нарастання польскай ваеннай пагрозы больш устойлівай буфернай дзяржавы, існаванне якой дазволіла б пазбегнуць у гэты перыяд прамой вайны паміж Польшчай і РСФСР.

**1921** год — падпісаны дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і Беларускай ССР.

У свеце

**1867** год — нарадзіўся Вікенцій Вікенцьевіч Верасаеў, рускі пісьменнік, літаратуразнавец, перакладчык. Належаў да групы пісьменнікаў, якія працягвалі традыцыі рускага крытычнага рэалізму. Аўтар кніг «Запіскі ўрача», «Жывое жыццё», раманаў «У тупіку», «Сёстры», аповесцяў «Два канцы», «На павароце», запісак «На вайне» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1945 годзе.

**1920** год — «сухі закон» у ЗША замацаваны Канстытуцыяй. Яшчэ ў 1917 годзе Кангрэс ЗША прыняў і накіраваў на зацвярджэнне штатаў праект васямнаццатай папраўкі да Канстытуцыі аб увядзенні «сухога закона». У верасні таго ж года ў краіне была спынена вытворчасць віскі, а ў маі 1919-га тая ж доля спасцігла вытворчасць піва. З 1 ліпеня 1919 года на тэрыторыі ЗША быў цалкам забаронены продаж спіртных напояў. 16 студзеня 1920 года была прынята 18-я папраўка да Канстытуцыі ЗША. Закон пазбаўляў ліцэнзій на бізнес вінаробаў, вінакураў, пастаўшчыкоў алкаголю і гандляроў спіртным. Супраць ратыфікацыі «сухога закона» выступілі штаты Канектыкут, Ілінойс, Род-Айленд і Вісконсін. Менавіта адтуль у іншыя штаты ішла кантрабанда алкаголю.

**1934** год — нарадзіўся Васіль Ланавой, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР, артыст Маскоўскага тэатра імя Я. Вахтангава. Зняўся ў кіна- і тэлестужках «Атэстат сталасці», «Вайна і мір», «Ганна Карэніна», «Афіцэры» і многіх іншых. Аўтар успамінаў «Шчаслівыя сустрэчы». Лаўрэат Ленінскай прэміі.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.19 | 17.20 | 8.01 |
| Віцебск | 9.15 | 17.03 | 7.48 |
| Магілёў | 9.09 | 17.10 | 8.01 |
| Гомель | 8.59 | 17.14 | 8.15 |
| Гродна | 9.33 | 17.36 | 8.03 |
| Брэст | 9.27 | 17.44 | 8.17 |

**Месяц**

***Першая квадра 14 студзеня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

*Пр.* *Серафіма, Сільвестра, Ульяны.* *К.* *Арнольда, Ізыдара, Макара, Паўла.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Аб'ява:**

**«Чалавек, які згубіў пашпарт на імя Сяргеева Алега Мікалаевіча, запісвайце: штомесячны плацеж за плазменны тэлевізар складае 150 рублёў».**

— Я гатовы дастаць табе Месяц з неба!

— Каструля патрэбная.

— ...І зоркі!

— Купі каструлю.

— ...Назаву планету імем тваім!

— За сто рублёў.

**Раз даішнікі на дарогах зарабляюць, дык хай кожны свой участак і адрамантуе!**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 139.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 студзеня 2019 года.